

КАЛІ СЛЕДЧЫ — ШМАТДЗЕТНАЯ МАЦІ 5

ТАЯ, ШТО ВУЧЫЦЬ СПАЗНАВАЦЬ ЖЫЦЦЁ 8



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

16 КАСТРЫЧНІКА 2021 г. СУБОТА № 200 (29569)

## КОРАТКА

• **Калектыў Рэспубліканскага клінічнага медыцынскага цэнтра Упраўлення справамі Прэзідэнта ўдастоены Падзякі Прэзідэнта за высокае прафесійнае майстэрства, значныя дасягненні ў сферах аховы здароўя.**

• Дзіцячы фонд у Віцебскай вобласці дапамагае сем'ям слабых катэгорый і рэалізоўвае вучэбныя праекты.

• **У Гродзенскай вобласці з пачатку года пабудавалі больш чым 1,2 тысячы кватэр для шматдзетных.**

• Школьнікі і іншыя навучэнцы з прыкметамі ВРВІ могуць не наведваць заняткі без даведкі да пяці дзён.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір ПАЗНЯКОЎ, намеснік старшыні Федэрацыі прафсаюзаў**

*«На сустрэчах у калектывах узнімаюцца пытанні індэксацыі пенсіі, якая не заўсёды праходзіць паралельна росту цэн. Мы накіроўвалі калегіяльныя прапановы ў Мінпрацы і сацабароны. Яны ў той ці іншай ступені ўключаны ва Указ «Аб добраахвотным страхаванні дадатковай назапашвальнай пенсіі». Мы рады, што з'явіўся інструмент, які стане больш прывабным сярод работнікаў і наймальнікаў. Як нам бачыцца, найбольш папулярнай будзе формула «3+3», калі 3 % добраахвотна выплачвае работнік, столькі ж дадаткова выплачвае наймальнік. Прафсаюзы праводзілі папярэдніх разлікі: пры ўсярэдненых паказчыках сярэдняй зарплаты памер дадатковай выплаты пасля выхаду на пенсію пры ўмове, што каля пяці гадоў будзе ісці працэс назапашвання, складзе каля Br110».*

ISSN 1990 — 763X

З першых вуснаў

# «ТОЛЬКІ АБ'ЯДНАЎШЫ НАМАГАННІ, МЫ ЗМОЖАМ ПАСПЯХОВА СУПРАЦЬСТАЯЦЬ УСІМ ВЫКЛІКАМ І ПАГРОЗАМ»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў удзел у пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Традыцыйна сустрэча прайшла ў фармаце відэаканферэнцыі.**



Фота БелТА.

На парадку дня было 11 пытанняў. Вядучая тэма пасяджэння — узаемадзеянне краін у фармаце Садружнасці, старшынства ў СНД у 2022 годзе, якое пераходзіць да Казахстана. У цэнтры ўвагі таксама Пагадненне аб стварэнні Савета старшыняў вярхоўных (вышэйшых) судоў. Прынята рашэнне аб аб'яўленні малдаўскага горада Камрата культурнай сталіцай Садружнасці на 2023-ы год. Удзельнікі пасяджэння абмеркавалі заявы аб супрацоўніцтве ў сферах біялагічнай бяспекі і развіцці супрацоўніцтва ў сферы міграцыі, рашэнне аб кіраўніку Антытэрарыстычнага цэнтра СНД.

Адкрываючы пасяджэнне, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што менш за тры месяцы застаецца да завяршэння адказнай і ганаровай місіі Рэспублікі Беларусь — старшынства ў органах Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Ён заўважыў, што на працягу года беларускі бок паслядоўна рэалізоўвае палажэнні Канцэпцыі і мерапрыемствы Плана старшынства, адаптуючы іх выкананне да новых рэалій. Асаблівая ўвага ўдзяляецца ажыццяўленню ініцыятыў краін-удзельніц. Важнае значэнне надаецца пытанням развіцця агульнай эканамічнай прасторы, пашырэння і павышэння эфектыўнасці ўзаемнага гандлю.

«Вядзецца работа па пагадненні аб свабодным гандлі паслугамі, скарачэнні да мінімуму абмежаванняў і выключэнняў з рэжыму свабоднага гандлю таварамі, а таксама па пытаннях ліквідацыі тэхнічных бар'ераў, уніфікацыі правілаў і працэдур дзяржаўных закупак. Асноўныя намаганні ў культурна-гуманітарнай сферы былі накіраваны на далейшае развіццё супрацоўніцтва і ўдасканаленне арганізацыйна-прававых асноў маладзёжнай палітыкі, культуры, навукі, адукацыі, аховы здароўя, спорту, турызму, працы і сацыяльнай абароны. Як відаць, сфера дзейнасці СНД вельмі шырокая», — расказаў Прэзідэнт. Безумоўна, працягваецца работа па мінімізацыі распаўсюджвання каранавіруснай інфекцыі і яе наступстваў.

«Рабочыя дакументы нашага пасяджэння датычацца такіх важных тэм, як развіццё супрацоўніцтва ў галіне забеспячэння біялагічнай бяспекі, у сферах міграцыі, абароны выбарчых правоў грамадзян і гарантый электаральнага суверэнітэту краін СНД. Патрабаванням сённяшняга дня цалкам адпавядае абноўлены Дагавор аб супрацьдзеянні легалізацыі (адмыванню) даходаў, атрыманых злачынным шляхам, фінансаванню тэрарызму і распаўсюджванню зброі масавага знішчэння», — паведаміў ён.

### Універсальнасць, добраахвотнасць, раўнапраўе

Беларускі лідар назваў пасяджэнне знакавым для Рэспублікі Беларусь і ўсіх краін Садружнасці. Яно праходзіць напярэдадні трыццацігоддзя СНД, якое фармальна наступіць 8 снежня.

«Існуюць розныя пункты гледжання аб спыненні існавання Савецкага Саюза, а калі больш дакладна, то яго прымусовым развале. Маё адмоўнае стаўленне да гэтых падзей усім добра вядома. Але ў той крытычнай сітуацыі стварэнне інтэграцыйнага «купала», які схаваў былыя саюзныя рэспублікі ад хаосу і эканамічнага калапсу, было, хутчэй за ўсё, правільным рашэннем», — адзначыў ён.

СТАР. 2

Без тэрміну даўнасці

# «І ГОРА БЫЛО ТАКІМ МОЦНЫМ, ШТО ПЕРАДАЛОСЯ ПРАЗ ГЕНЫ»

**Жыхарка вёскі Мікалаеўка Бялыніцкага раёна Ларыса КЛІМЯНОК расказала пра трагедыю, якая адбылася з яе сястрой і братамі**



**Экспедыцыю ў Малінаўку арганізаваў навуковы супрацоўнік музея гісторыі Магілёва ветэран пошукавага руху Пётр ХАВАНСКІ. Прызнаўся, што пачутая ім гісторыя не дае спакою. Падчас Вялікай Айчыннай вайны нелюдзі ў фашысцкай форме пад знакам барацьбы з партызанамі зажыва спалілі шасцярых дзяцей разам з трыма жанчынамі — іх маці. «І пасля гэтага яшчэ знаходзяцца тыя, хто дазваляе сабе апраўдваць нацызм», — абураецца ён. Пётр Іванавіч паклікаў з сабой яшчэ і школьнікаў, каб пачулі жахлівы аповед з першых вуснаў. Патрыятычнае выхаванне немагчыма без такіх вось сустрэч, уражанняў, прыватных гісторый, дзе ніякіх прыцягнутых за вушы фактаў — адзін суцэльны боль. Каб зразумець нешта, трэба гэтым прасякнуцца. Перажыць эмацыянальнае ўзрушэнне.**

СТАР. 7

Спажывец

# ВОСЕНЬСКІ СУПЕРФУД

**Даведаліся аб цэнах на галоўныя восеньскія ягады, спосабах іх захоўвання і «прафесійных рызыках» пры зборы журавін**

**У разгары сезон журавін. Менавіта цяпер самы час назапасіць гэтых ягад на доўгі перыяд халадоў і праступ. Якім чынам запасаца, кожны вырашае сам. Хтосьці адпраўляецца па халодную восеньскай расе з вядром на балота, хтосьці — на рынак, пажадана таксама з раніцы. Сонням журавін можа не дастаца: тавар запатрабаваны.**

СТАР. 13



# «ТОЛЬКІ АБ'ЯДНАЎШЫ НАМАГАННІ, МЫ ЗМОЖАМ ПАСПЯХОВА СУПРАЦЬСТАЯЦЬ УСІМ ВЫКЛІКАМ І ПАГРОЗАМ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што за тры дзесяцігоддзі Садружнасць прайшла нялёгкі шлях станаўлення і стала прызнанай міжнароднай супольнасцю рэгіянальнай арганізацыяй. «Універсальнасць, добраахвотнасць, раўнапраўе — асноўныя прынцыпы, якія спрыялі стрымліванню многіх разбуральных працэсаў, дапамаглі стабілізацыі эканомік, захаванню гандлёвых сувязяў паміж нашымі краінамі», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт нагадаў, што па традыцыі ў юбілейны год прымаецца адпаведная Заява кіраўнікоў дзяржаў Садружнасці. Паводле яго слоў, у прадстаўленым праекце падведзены вынікі трыццацігадовай дзейнасці арганізацыі, вызначаны задачы па пашырэнні ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва, адаптацыі СНД да цяперашніх рэалій, процідзеяння сучасным выклікам і пагрозам.

У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка вылучыў некалькі тэм, якія, на яго погляд, заслугоўваюць асаблівай увагі.

### Захаванне кантактаў

Кіраўнік дзяржавы назваў адным з ключавых дасягненняў СНД захаванне цесных чалавечых кантактаў, даверных палітычных адносін, шматпланавых гаспадарчых сувязяў з прыцэлам на далейшую інтэграцыю.

«Ва ўмовах нестабільнасці ў свеце кааперацыя ўзаемадапаўняльных эканомік дзяржаў СНД мае вырашальнае значэнне. Трэба разумець, што нідзе ні на якіх рынках нас ніхто не чакае. Рынкі даўно ўжо падзелены. Таму, дай Бог, утрымаць свае, і таму тут нам трэба шукаць сваё шчасце», — падкрэсліў ён.

### Канкрэтныя крокі па спалучэнні рэгіянальных інтэграцыйных працэсаў

«Мяркую, што актуальныя пытанні парадку дня ў фармаце СНД павінны перш за ўсё ўлічваць тое, што адбываецца ў Вялікай Еўразіі. А па асобных тэмах маглі б быць сінхранізаваныя з праблематыкай, што абмяркоўвалася ў рамках Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы і Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

### Супраціўленне ціску

«Год ад году з-за беспакаранасці і праславутага права сілы меры, якія прымаюцца да нашых краін, становяцца ўсё шырэйшымі і не такімі бяскрыўднымі для нацыянальных эканомік. Вы ўсе ведаеце, з якім беспрэцэдэнтным санкцыйным ціскам сутыкнулася ў гэтым годзе Беларусь. І не толькі Беларусь», — заўважыў Прэзідэнт.

### Абарона інтарэсаў на сусветным рынку

Неабходнасць далейшых крокаў па аб'яднанні намаганняў для сумеснай абароны інтарэсаў на сусветным рынку Аляксандр Лукашэнка звязвае з мэтамі па ўмацаванні ролі і вагі Садружнасці.

«Нам неабходныя актывізацыя ўзаемнага гандлю і інвестыцый, звядзенне да мінімуму штучных бар'ераў. Толькі аб'яднаўшы намаганні і павысіўшы ролю Садружнасці як рэгіянальнага гульца, мы зможам паспяхова супрацьстаяць усім выклікам і пагрозам», — упэўнены беларускі лідар. На яго думку, у існуючых умовах Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі зноў можа выступіць «лакаматывам» інтэграцыйных працэсаў, прапанаваўшы для ЕАЭС і СНД найлепшыя напрацоўкі. Ён звярнуў увагу на рознаўзроўневую інтэграцыю, якая складваецца на постсавецкай прасторы.

«Думаю, гэта будзе рэальным укладам у гарманізацыю падобных працэсаў з суседнімі рэгіянальнымі аб'яднаннямі ў мэтах эканамічнай кансалідацыі Еўразіі і фарміравання вялікага еўразійскага партнёрства», — заявіў Прэзідэнт.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Падрабязнасці

## АСАБЛІВЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ПРЫЁМУ НА РАБОТУ

**Як узмоцнены патрабаванні да кіруючых кадраў і работнікаў арганізацый у адпаведнасці з Дэкрэтам № 6, які ўступае ў сілу 24 кастрычніка, растлумачылі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны.**




Фота БелТА

Сярод нававўведзеных — асаблівыя патрабаванні падчас прыёму на работу. У прыватнасці, прадугледжваецца абавязак наймальніка пры прыёме кандыдата на работу ў дзяржаўныя органы, дзяржарганізацыі або арганізацыі, у статутным фондзе якіх 50 і больш працэнтаў акцый (доляў) ва ўласнасці дзяржавы, запытваць характарыстыку з папярэдняга месца яго работы, характарыстыку з дзяржарганізацый, якія з'яўляліся месцам яго работы на працягу папярэдніх пяці гадоў. Калі такіх месцаў было некалькі, характарыстыка запытваецца па апошнім з іх. Таксама патрабуюцца звесткі з Адзінага дзяржаўнага банка даных аб правапарушэннях у дачыненні да кандыдатаў на кіруючыя пасады, якія падаюцца органамі ўнутраных спраў бясплатна.

Замацоўваюцца і патрабаванні да характарыстыкі. «Характарыстыка з'яўляецца афіцыйным дакументам, у якім павінны быць адлюстраваны прафесійныя, дзелавыя і маральныя якасці работніка, звесткі аб прыцягненні да дысцыплінарнай і іншай адказнасці, здзяйсненні дзеянняў, якія супярэчаць дзяржаўным або грамадскім інтарэсам. Форма характарыстыкі будзе ўстаноўлена Саветам Міністраў, — растлумачылі ў Мінпрацы і сацабароны. — Таксама павялічаны тэрмін, на працягу якога павінна быць выдадзена характарыстыка пры паступленні адпаведнага запыту, з 5 да 7 каляндарных дзён».

Парушэнні прадугледжанага парадку прыёму на работу, прызначэння на пасаду, выдача характарыстык, якія ўтрымліваюць загадзя няпраўную інфармацыю, а таксама парушэнне тэрмінаў іх выдачы прызнаюцца грубым парушэннем працоўных абавязкаў. Такія дзеянні могуць пацягнуць звальненне кіраўніка арганізацыі і (або) іншых адказных службовых асоб.

Калі такія дзеянні прычынілі шкоду дзяржаўнай уласнасці альбо істотную шкоду дзяржаўным ці грамадскім інтарэсам, вінаватыя будуць несці крымінальную адказнасць.

Таксама пашыраны паўнамоцтвы наймальніка, які атрымаў права адхіляць чалавека ад працы ў выпадках, калі той заклікае калегаў да забастоўкі без уважлівых прычын.

Уведзена новая падстава для звальнення — парушэнне работнікам парадку збору, сістэматызацыі, захоўвання, змены, выкарыстання, блакіравання, распаўсюджвання, прадастаўлення, выдалення персанальных даных (п.10 арт. 47 ПК). Дадзеная падстава аднесена да дыскрэдытуючых абставін звальнення.

Кантэкст

# Нялюдскасць у законе

## Польскі парламент прагаласаваў за легалізацыю выгнання мігрантаў на граніцу

**Таксама адобрана будаўніцтва прыгранічнага збудавання коштам 353 мільёны еўра, якое павінна быць абсталявана датчыкамі руху. Змяненні ў закон прадугледжваюць, што мігранты, якія незаконна перасякаюць граніцу і затрыманыя на месцы, павінны пакінуць тэрыторыю Польшчы. Ім таксама будзе забаронены ўезд у краіну на тэрмін ад шасці месяцаў да трох гадоў, паведаміла Deutsche Welle. Акрамя таго, нававўведзенне дазваляе польскім уладам пакідаць без разгляду заяву аб выдзяленні прыстанішча, якая пададзена пасля незаконнага перасячэння граніцы, калі заяўнік не прыбыў непасрэдна з зоны, дзе яго жыццё або свабода знаходзяцца пад пагрозай.**

У апошнія тыдні Варшава размясціла на граніцы тысячы салдат, узвяла агароджу з калючага дроту і ўвяла надзвычайнае становішча, якое забараняе журналістам і гуманітарным арганізацыям доступ да ўсёй лініі 400-кіламетровай граніцы. Раней многія праваабарончыя арганізацыі звярталіся да польскіх улад з заклікам забяспечыць правы мігрантаў і аказаць ім неабходную дапамогу. Так, міжнародная праваабарончая арганізацыя Amnesty International заклікала Польшчу даць бежанцам, якія шукаюць абароны, доступ у краіну. Як заявіла дырэктар прадстаўніцтва Amnesty International пры еўрапейскіх інстытутах у Брусэлі Ў Гедзі, у арганізацыі ёсць пераканаўчыя доказы таго, што афганскія бежанцы сталі ахвярамі незаконнага прымусовага вяртання ў Беларусь.

Днямі ў прыгранічнай з Беларуссю польскай зоне быў знойдзены труп яшчэ аднаго нелегальнага мігранта. Цела мужчыны было заўважана ў полі экіпажам паліцэйскага верталёта ў ходзе патрулявання тэрыторыі, на якой дзейнічае рэжым надзвычайнага становішча. Прэс-сакратар паліцыі Томаш Крупа сказаў польскаму выданню Gazeta Wyborcza, што загінулы — 24-гадовы бежанец з Сірыі. Паводле інфармацыі ўлад Польшчы, Літвы і Беларусі, увогуле ўжо сем чалавек былі знойдзены мёртвымі на граніцы з той пары, як рэгіён сутыкнуўся з беспрэцэдэнтным наплывам мігрантаў гэтым летам.

Між тым стала вядома, што польскія сілавікі даставілі вялікую групу бежанцаў да граніцы. Пра гэта паведамілі ў Дзяржпагранкамітэце. «Польскія сілавікі на некалькіх транспартных сродках даставілі на лінію польска-беларускай граніцы групу бежанцаў — каля 20 чалавек. У мэтах далейшага гвалтоўнага выцяснення прадстаўнікі пагранічнай варты загадзя часткова дэманціравалі загароду, якая была ўсталявана на польскай тэрыторыі», — расказалі ў ДПК. Спроба непрыкметна выцісну ць чарговую групу ў Беларусь не ўдалася з прычыны апаратыўнага прыбыцця беларускага пагранічнага нарада. «Нягледзячы на тое, што польскія ваенныя прымушалі замежнікаў незаконна перасекчы граніцу, уся група працягвала заставацца на тэрыторыі Польшчы і адмаўлялася ісці праз дэманціраваную загароду. У выніку польскі бок быў вымушаны забраць усіх бежанцаў. Факты падвозу польскімі сілавікамі бежанцаў з глыбіні сваёй тэрыторыі фіксуюцца штодня. Бесчалавечныя метады і спосабы выцяснення замежнікаў, выкарыстанне ў дачыненні да людзей зброі і дубінак старанна ўтойваюцца ад грамадскасці і тым больш ад еўрапейскіх міжнародных арганізацый, — адзначылі ў ведамстве. — Доказам абыякавасці Польшчы да лёсаў бежанцаў з'яўляецца і той факт, што яе ўлады пастаянна заяўляюць аб неабходнасці дадатковага фінансавання з боку ЕС барацьбы з міграцыйным крызісам. Аднак просяць грошы не на дапамогу людзям, якія знаходзяцца ў складанай сітуацыі, а на стварэнне ўзаконенай сістэмы парушэння правоў чалавека».

Еўрапейскі саюз наўрад ці застанецца ўбаку ад дэмаршу Польшчы наконт еўрапейскага права ў адносінах да бежанцаў. Такім меркаваннем у эфіры «Альфа Радыё» падзяліўся **палітолаг Аляксей ДЗЕРМАНТ.** «З юрыдычнага пункту гледжання Польшча парушае свае міжнародныя абавязацельствы, што існуюць у рамках ААН у адносінах да асоб, якія знаходзяцца ў неабароненым становішчы. Таксама яна парушае нормы ЕС, з якімі Польшча пагаджалася, перш чым уступіла ў гэту арганізацыю. У цяперашніх папраўках ёсць такая фармулёўка «...калі асобы не прыязджаюць з краін, у якіх ім нешта пагражае». Дык у тым і справа, што прыязджаюць, паколькі пагражае, бо ў Афганістане і Іраку існуе небяспека вайны, пагроза для жыцця пэўных асоб. Атрымліваецца, што палякі закрываюць вочы на тое, што мігранты маюць сапраўдную патрэбу ў дапамозе і імкнуцца ў ЕС», — заўважыў эксперт.

Ён упэўнены, што ўзвядзенне агароджы польскім бокам на граніцы з Беларуссю не спыніць міграцыйны паток. «Для таго каб спыніць такі паток, павінен быць выбудаваны ланцужок паміж Афганістанам, Іракам, Расіяй, Беларуссю, Польшчай і Германіяй. Калі не будзе выбудавана сістэма супрацоўніцтва праваахоўных органаў, то ніякія дзіркі не ўдасца закрыць такімі агароджамі, гэта відавочна, — адзначыў Аляксей Дзермант. — Польшча, разумеючы, што сапсавала адносіны з Беларуссю, цяпер не можа справіцца з міграцыйным патокам і робіць папулісцкія хады. Яны баяцца, паколькі забеспячэнне еўрапейскай бяспекі — гэта комплекс мер, які датычыцца не толькі стварэння нармальных умоў для прыёму, але і кантролю на граніцы, а гэта немагчыма без Расіі, Турцыі, Беларусі. Польшча разумее, што патрэбны палітычны дыялог, а значыць — прызнаць дзеючую беларускую ўладу, ад якой, між іншым, залежыць бяспека еўрапейцаў».

Аляксей Дзермант лічыць, што з пункту гледжання еўрапейскага права Польшча парушыла яго нормы і сваё нацыянальнае заканадаўства паставіла вышэй за міжнародныя абавязацельствы. «Польшча выводзіць сябе з рамак дзеяння еўрапейскага права, і ўзнікаюць адпаведныя пытанні, яны ж пагаджаліся ўвайсці ў ЕС, атрымлівалі грошы, а цяпер гавораць, што не хочуць выконваць свае абавязацельствы. Брусель, Берлін будуць прымаць пэўныя меры, у тым ліку санкцыі і зніжэнне фінансавай дапамогі», — дадаў палітолаг.

Заходнія краіны сваімі дзеяннямі руйнуюць міжнародную сістэму права. Такое меркаванне БелТА выказаў **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў, старшыня Ліберальна-дэмакратычнай партыі Беларусі Алег ГАЙДУКЕВІЧ.** «Польскі сейм прыняў закон аб бежанцах. Зараз іх будуць выганяць з Польшчы, нават не даючы магчымасці заявіць аб выдзяленні прытулку, — адзначыў дэпутат. — А чаго вы лезлі ў Ірак, Сірыю, Афганістан са сваімі казкамі аб свабодзе і дэмакратыі? Хто даваў вам права бамбіць гарады, расстрэльваць людзей, уводзіць свае войскі, выпампоўваць нафту, газ, рэсурсы? Сёння вы кінулі гэтых людзей! Яны ідуць да вас, вы ж першыя прыйшлі. Хто вас клікаў?» У сувязі з гэтым дэпутат лічыць, што ў Захаду няма маральнага права павучаць іншыя краіны. «І потым вы збераецеся ў Еўрапарламенце і будзеце прымаць смешныя рэзалюцыі па Беларусі і Расіі. І думаеце, нехта ў Мінску ці Маскве будзе ўспрымаць іх без усмешкі. І зараз вы вучыце Беларусь і Расію? Чаму? Мы не бамбілі Ірак і Югаславію. Мы заўсёды толькі ратавалі вас. Вы разбураеце міжнародную сістэму права. Але ў канчатковым выніку гэта ўдарыць па вас, так было заўсёды», — перакананы Алег Гайдукевіч.

**Пётр ДУНЬКО.**

Блізкая ўлада

# ПАДАТКІ, ЖЫЛЛЁ, МЕДАБСЛУГОЎВАННЕ

## Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА правеў асабісты прыём у Глыбокім

**Людзі звярнуліся па вырашэнне праблемы работы ФАПа, па дапамогу ў атрыманні жылля і наконт падатковага пытання, паведаміла БелТА.**

Першым прыйшоў на прыём жыхар Глыбокага. Пенсіянер расказаў, што яго сын больш за 20 гадоў жыве ў ЗША, але зарэгістраваны ў доме бацькі. Мужчына штогод плаціць падатак на жылы дом і зямельны ўчастак, грошай спаганяецца больш з-за рэгістрацыі сына, хоць ён фактычна не пражывае ў доме. Цяпер такія нормы заканадаўства. Уладзімір Андрэйчанка расказаў, што Міністэрства па падатках і зборах унесла прапанову па ўвядзенні льгот пенсіянерам, інвалідам першай і другой груп і іншым катэгорыям па аплаце збору за дом і ўчастак. Магчыма, налета парламентарыі прымуць такую папраўку ў заканадаўства.

75-гадовы пенсіянер звярнуўся з просьбай аб дапамозе ў атрыманні больш камфортнага жылля. Глыбоцкі райвыканкам разгледзіць варыянты вырашэння пытання і дапаможа пенсіянеру: дзеці яго жывуць у Расіі, і сваякоў тут няма. Мужчыну таксама дапамогуць



Фота БелТА.

прайсці медабследаванне пасля спаду каранавіруснай хвалі.

Жыхарка вёскі Пліса звярнулася з просьбай аднавіць работу ФАПа, яго зачынілі ў чэрвені з-за выхаду медработніка на пенсію. Фельчарска-акушэрскі пункт абслугоўвае каля 360 жыхарак. Пакуль два разы на тыдзень у Плісу будзе прыязджаць медык з суседняй вёскі Мнюта, а па серадах будзе прымаць урач.

Падчас сустрэчы з журналістамі Уладзімір Андрэйчанка адзначыў, што пастаянная ўвага да людзей — галоўны фактар забеспячэння сацыяльнай стабільнасці і захавання суверэнітэту дзяржавы. «Улады павінны заўсёды чуць абгрунтаваныя просьбы і пастарацца іх вырашыць — такое няўхільнае патрабаванне Прэзідэнта да чыноўнікаў усіх рангаў. Убаку не застаюцца дэпутаты і разбіраюцца ў праблемах. Дробных пытанняў няма: гэта і ЖКГ, і медыцына, і занятасць насельніцтва. Вядома ж, стараемся знайсці пазітыўнае вырашэнне ўсяго. Таксама ставім задачу, каб выраўняць эканамічны патэнцыял рэгіёнаў і ўзровень жыцця людзей. Задача няпростая і пад сілу толькі дзяржаве. Важную ролю тут адыграе дэпутацкі корпус, мы працуем разам з мясцовымі саветамі, яны бяруць пытанні на кантроль і дапамагаюць іх вырашаць. Гэтыя напрацоўкі выкарыстоўваем у нашай заканатворчай дзейнасці, цяпер практычна завершана работа над праектам новай рэдакцыі Канстытуцыі, але прапановы яшчэ паступаюць.

Працуем над праектамі бюджэту на 2022 год, закона аб звароце грамадзян і юрыдычных асоб, а таксама Падатковага кодэкса. Сёння ёсць навоўвядзенні, якія неадназначна падтрымліваюцца насельніцтвам. Дэпутатам трэба гэта ўсё ўлічыць, каб задавальняла і людзей, і ўлады», — адзначыў Старшыня Палаты прадстаўнікоў.

# Інфармацыйная бяспека як аснова захавання незалежнасці краіны

**Як мы ўжо паведамлялі, на гэтым тыдні прэм'ер-міністр Беларусі Раман ГАЛОЎЧАНКА падпісаў пастанову Савета Міністраў № 575 «Аб мерах процідзеяння экстрэмізму і рэабілітацыі нацызму».**

У афіцыйным тэлеграм-канале МУС Беларусі ведамства пракаментавала дадзеную пастанову. «Указаная пастанова рэгламентуе парадак прызнання экстрэмісцкімі фарміраванні тых грамадзян, якія аб'ядналіся рознымі спосабамі, уключаючы выкарыстанне інтэрнэт-рэсурсаў, для стварэння экстрэмісцкіх матэрыялаў, іх папулярызацыі і распаўсюджвання, а таксама для ажыццяўлення іншай дзейнасці, накіраванай на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы дзяржавы. Згодна з законам аб супрацьдзеянні экстрэмізму, прызнаваць экстрэмісцкімі фарміраванні ўпаўнаважаны Міністэрства ўнутраных спраў і Камітэт дзяржаўнай бяспекі. Стваральнікі, арганізатары і ўдзельнікі дадзеных фарміраванняў будуць прыцягвацца да крымінальнай адказнасці па артыкуле 361-1 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь», — расказаў **начальнік аддзела ГУБАЗіК Вячаслаў АРЛОЎСКІ.**

Паводле яго слоў, скончана дэанамізацыя адміністратараў і найбольш актыўных падпісчыкаў экстрэмісцкіх каналаў і чатаў. Задакументаваны паведамленні ў месенджарах, якія заклікалі да экстрэмісцкай дзейнасці. Вячаслаў Арлоўскі падкрэсліў, што такія меры дазволяць удзяліць увагу кожнаму падпісчыку экстрэмісцкіх тэлеграм-каналаў і чатаў, даць прававую адзнаку. Ён заклікаў грамадзян не давяраць фэйкам і іншай прапагандзе антыдзяржаўных інфармацыйных крыніц аб тым, што дзейнасць па падтрымцы экстрэмісцкіх рэсурсаў акажацца бяскарнай.

Пастанову Саўміна № 575 «Аб мерах супраць экстрэмізму і рэабілітацыі нацызму» пракаментаваў **загадчык аддзела сацыялогіі дзяржаўнага кіравання Інстытута сацыялогіі НАН кандыдат філасофскіх навук Мікалай ШЧОКІН.** Яго словы прыводзіць БелТА.

«Беларусь падверглася інфармацыйнай атацы з ужываннем разнапланавай методыкі па ўкараненні штучна створаных псеўдакаштоўнасцяў і жыццёвых прынцыпаў для псіхалагічнай дэзарыентацыі грамадзян з мэтай падрыхтоўкі дзяржаўнага перавароту з наступнай зменай улады. Мы з'яўляемся сведкамі новых прынцыпаў і механізмаў не проста рэалізацыі планаў па змене ўрадаў, але перш за ўсё культурнага перакадзіравання народа і ў рэжыме хаосу, якім можна кіраваць», — упэўнены аналітык.

Паводле яго слоў, аптымальнай сістэмы абароны ад інфармацыйнай інтэрвенцыі ў сусветнай практыцы не існуе. У залежнасці ад сваіх мэт кожная краіна выбірае найбольш аргантнае рашэнне ў адпаведнасці з існуючымі ўмовамі. І інфармацыйная бяспека стала асноўным пытаннем у захаванні суверэннасці і незалежнасці дзяржавы.

Эксперт упэўнены, што дадзеныя прэвентыўныя меры з'яўляюцца, з аднаго боку, ідэалага-выхаваўчым працэсам, а з другога — замацоўваюць за дзяржавай абсалютнае права рэгуляваць узаемадзеянне як паміж грамадзянамі, так і паміж грамадствам і самой дзяржавай.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Бяспека

# ДАПАМОГА ПОБАЧ

## У Радашковічах пасля рэканструкцыі адкрылі пажарнае дэпо

**Абноўленае падраздзяленне Міністэрства па надзвычайных сітуацыях будзе абслугоўваць сам пасёлак, у якім пражывае звыш шасці тысяч чалавек, населеныя пункты на тэрыторыі Радашковіцкага сельскага Савета, а таксама найбліжэйшыя вёскі Мінскага раёна. Акрамя таго, у зоне адказнасці пажарнага дэпо — школы, медыцынскія ўстановы, прадпрыемствы, размешчаныя на тэрыторыі пасёлка.**



Фота Мінскага абласнога ўпраўлення МНС.

— Адкрыццё падраздзялення МНС у Радашковічах — вынік планамернай работы, — адзначыў **намеснік старшыні Мінаблвыканкама Аляксандр КРУЧАНАЎ.** — Сёння на месцы старой часці, якая не адпавядала тэмпам развіцця і патрабаванням рэгіёна ў плане забеспячэння пажарнай бяспекі людзей, мы бачым новы будынак, укамплектаваны сучаснай тэхнікай, што дазволіць дастаткова аператыўна рэагаваць на ўсе надзвычайныя сітуацыі. На наступны год мы запланавалі адкрыццё пажарнага дэпо ў Беразіне.

Як запэўніў **першы намеснік міністра па надзвычайных сітуацыях Аляксандр ХУДАЛЕЕЎ**, у хуткім часе ратавальнікі дакажуць, што кожны жыхар можа разлічваць на аператыўную дапамогу. «Для асабовага складу створаны камфортныя ўмовы нясення службы, падтрымкі добрай фізічнай формы, а гэта дазваляе ратавальнікам павышаць эфектыўнасць баявой работы, выконваць задачы па абароне жыцця і здароўя людзей», — адзначыў прадстаўнік ведамства.

Абноўленае падраздзяленне ўкамплектавана сучаснай пажарнай аварыйна-ратавальнай тэхнікай і абсталяваннем. Безумоўна, усё гэта дазволіць яшчэ больш аператыўна рэагаваць на надзвычайныя здарэнні. Праўда, лепш, каб іх увогуле не было.

**Вераніка КАНЮТА.**

**Калектыў Выдавецкага дома «Звязда» выказвае шчырыя спачуванні Вользе Пятроўне Цыбульскай з прычыны напаткаўшага яе вялікага гора — смерці БАЦЬКІ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Еўропа пачала адпампоўваць газ са сховішчаў



Як сведчаць даныя Gas Infrastructure Europe, днямі адбор упершыню за сезон прыкметна (на 70 %) перавысіў запампоўку. Пачалі расход газу са сховішчаў Германія (найбуйнейшы газавы рынак Еўропы), а таксама Францыя, Чэхія і Аўстрыя. З пачатку кастрычніка расходуе свае запасы Венгрыя; Нідэрланды — з 5 кастрычніка, Польшча — з 10-га (рэспубліка таксама ўжо трэці месяц зніжае імпарт звадкаванага газу), Славакія — з 11-га. Летась пераход ад запампоўкі да адбору ў цэлым па Еўропе прыйшоўся на амаль той жа самы тэрмін. Пры гэтым і надвор'е ў гэтым годзе ў Еўропе прыкладна адпавядае леташняму. Аднак летась сітуацыя была прынцыпова іншая: у сховішчах быў рэкордны аб'ём газу, які ўдалося назапасіць па выніках дзвюх цёплых зім, і рынку было выгадна крыху раней «адкаркаваць» запасы. У гэтым сезоне запасы знаходзяцца на гістарычна мінімальным узроўні (крыху вышэй 78 %). Немагчымасць напоўніць сховішчы да надыходу халадоў з-за глабальнага дэфіцыту з'яўляецца галоўным фактарам, які штурхае цэны на газ уверх. Гэтаму таксама садзейнічае і рост кошту на іншым, яшчэ больш моцным полюсе попыту — у Азіі.

## Прагназуецца надзвычайны ўзровень голаду ў 47 краінах

Пра гэта сведчаць даныя справаздачы міжнароднай арганізацыі дапамогі галадаючым свету Welthungerhilfe, паведаміла Deutsche Welle. Зараз каля 811 мільёнаў чалавек па ўсім свеце сутыкаюцца з голадам, што на 161 млн больш, чым годам раней, пры гэтым 41 млн чалавек знаходзіцца на мяжы голаду. Як вынікае са справаздачы Welthungerhilfe, сёлета ад вострага голаду пацярпелі 155 млн чалавек, якія пражываюць у канфліктных рэгіёнах, — амаль на 20 млн больш, чым у 2019-м. У 47 краінах сітуацыя настолькі сур'ёзная, што да 2030 года там наўрад ці будзе дасягнуты нават нізкі ўзровень голаду, прагназуецца ў глабальным індэксе. Адзначаецца, што найгоршае становішча назіраецца ў Афрыцы і Паўднёвай Азіі. Сярод прычын, якія прывялі да пагаршэння становішча, — ковідныя абмежаванні і парушэнне ланцужкоў паставак, што абярнулася ростам спажывецкіх цэн. Таксама адной з прычын сталі маштабныя канфлікты, якія пачасціліся ў апошнія гады.

## Карціна Бэнксі пайшла з малатка за $25,4 млн

Работа «Каханне ў смеццевым баку», якая часткова была знішчана ўбудаваным у рамку шрэдарам у 2018 годзе, пайшла з малатка на аўкцыёне Sotheby's за рэкордную для мастака суму ў 18,58 млн фунтаў стэрлінгаў (каля $25,4 млн). Пра гэта паведамілі арганізатары аўкцыёна. Цана гэтай карціны стала рэкорднай для ўсіх прададзеных раней работ мастака, які хавае сваю асобу. «Прайшло амаль тры гады з аднаго з самых адметных момантаў у мастацтве перформансу ў гэтым стагоддзі, што ўвайшоў у гісторыю аўкцыёнаў. Было вельмі заўмальна сачыць за падарожжам гэтай цяпер легендарнай карціны і ў выніку зноў убачыць яе ў нашай зале, прапанаваць яе ў тым самым пакоі, дзе яна была створана мастаком. Бэнксі не прывык траплаць на першыя палосы, і гэты раздзел яго гісторыі захапіў уяўленне людзей ва ўсім свеце — мы можам толькі здагадвацца аб тым, што будзе далей», — завілі ў Sotheby's.






# БЫЦЬ СЛЕДЧЫМ — МАРА ДЗЯЦІНСТВА

## А яшчэ палкоўнік юстыцыі — эколаг, краязнаўца, музыкант, спартсмен...

На сваім месцы

**Начальнік Віцебскага раённага аддзела Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь Аляксандр МІЗАЎЦОЎ працуе ў абласным цэнтры другі месяц. Дагэтуль служыў у Сенненскім раёне: з 2015 года ўзначальваў мясцовы аддзел. Менавіта падчас яго кіраўніцтва раённы аддзел Следчага камітэта быў прызнаны найлепшым у вобласці. Аляксандр Мізаўцоў — не толькі добры кіраўнік і прафесіянал у сваёй справе, але яшчэ і шматгранная асоба.**

### Дзе Сянно — там душа!

Да работы ў Віцебску Аляксандр Вітальевіч жыў у Сянне. Там нарадзіўся, скончыў школу. Вучыўся на юрыдычным факультэце Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Між іншым, ён шматдзетны бацька: выхоўвае дваіх хлопчыкаў і дзяўчынку.

Аляксандр Мізаўцоў з'яўляецца дэпутатам Сенненскага райсавета. У 2018 годзе быў прызнаны «Чалавекам года Віцебшчыны». Следчы вельмі любіць свой родны край. І гэта адчуваецца адразу, як толькі ўступаеш у гутарку з ім.

Тыя, хто лічыць, што следчыя, тым больш кіраўнікі, людзі «сухія», не здольныя на эмоцыі, памыляюцца. Калі Аляксандр Вітальевіч расказвае пра Сенненскі раён, сваіх падначаленых, робіць акцэнт на іх узаемаадносінах і па-за службай.

— Яшчэ ў школе быў вельмі актыўным: прыйсці дамоў і толькі рабіць урокі — гэта не пра мяне, — згадвае начальнік Віцебскага раённага аддзела Следчага камітэта. — Хацелася развівацца ў інтэлектуальным, творчым, фізічным планах, мець стасункі з рознымі людзьмі, даследаваць родны край.

Ён вучыўся ў музычнай школе, якую скончыў на «выдатна». Умее іграць на домры, гітары і фартэпіяна. Калі пасля дзявятага класа яму прапанавалі паступаць у музычнае вучылішча, Аляксандр адмовіўся: ён ужо даўно вызначыўся, што будзе юрыстам. З дзяцінства марыў быць следчым у пракуратуры.

### Ліст хакеістам

Аляксандр Вітальевіч добра памятае свой першы вопыт следчага. Калі вучыўся



ва ўніверсітэце, атрымаў магчымасць прайсці стажыроўку ў Мінскай гарнізоннай ваеннай пракуратуры.

— Дыплом пісаў у сталіцы, меў пасведчанне выконваючага абавязкі следчага, — удакладняе ён. — Ездзіў у камандзіроўкі і дапытваў людзей. Было вельмі цікава выконваць адказныя даручэнні.

Аляксандр Мізаўцоў згадвае жудасны выпадак, калі на КПП загінулі двое салдат, якія атруціліся ўгарным газам...

Начальнік райаддзела шмат цікавага расказаў пра свае ініцыятывы ў розныя гады. Напрыклад, разам з землякамі пажадаў перамогі беларускім хакеістам. Пажаданні спартсменам зачыталі ў эфіры радыё.

— Праўда, вядучы эфіру паставіў націск няправільна ў назве райцэнтра, дык Прэзідэнт, які быў побач з тым, хто камэнціраваў, паправіў, — працягвае следчы. — Аднойчы я прапанаваў зрабіць відэазварот дзеля падтрымкі біятланісткі, нашай зямлячкі Ірыны Крыўко, якая ў выніку стала алімпійскай чэмпіёнкай. Упэўнены, што дзякуючы ў тым ліку і шчырай падтрымцы землякоў.

### Дапамога хлебаробам

У 2016-м Мізаўцоў прапанаваў калегам дапамагчы хлебаробам. Патэлефанаваў кіраўніку райвыканкама і сказаў, што ёсць шчырае жаданне паўдзельнічаць ва ўборцы. «У той год у Сянне праводзілі абласныя «Дажынкі», — расказвае Аляксандр. — Мы з калегамі працавалі на зернесушылцы. І ў наступным годзе таксама. Потым гэта стала традыцыяй».

Следчы не выключае, што гэтыя добрыя справы будуць мець працяг і на тэрыторыі Віцебскага раёна. Параўноўваючы, дарэчы, два раёны, начальнік аддзела адзначыў, што на тэрыторыі Віцебскага раёна злачыннасць у два разы вышэйшая, чым у Сянне. Яно зразумела: іншыя плошчы, большая колькасць насельніцтва.

Па яго словах, у раёнах на першым месцы па колькасці злачынстваў — крадзяжы. Другую пазіцыю займае крымінал у стане алкагольнага ап'янення: хуліганства, пагрозы забойствам, катаванне, прычыненне цялесных пашкоджанняў, іншыя бытавыя злачынствы. Забойствы, як правіла, учыняюцца падчас ужывання спіртнога. Ёсць нават такое паняцце, як «нецвярозы нож». Апошнім часам павялічваецца колькасць ахвяр кіберзлачынстваў. Летась быў проста ўсплёск, цяпер меншае: сваю ролю адыграла прафілактыка.

### Дзеля захавання памяці

Адзін з любімых заняткаў Аляксандра Мізаўцова — садзіць дрэвы. На малой радзіме з яго лёгкай рукі іх расце нямала. Напярэдадні Дня народнага адзінства, дзякуючы яму, прыгожая алея з'явілася і ў Прыдзвінні, у аграгарадку Акцябрская.

А яшчэ герой публікацыі шмат увагі ўдзяляе тэме Вялікай Айчыннай вайны, захаванню памяці аб гэтай падзеі, яе героях. У гэтым кірунку працуюць і следчыя раёна. Начальнік аддзела заўважае, што беларускі народ шмат новага даведаецца, што ўчынялі на нашай зямлі акупанты.

Яшчэ адзін клопат яго і падначаленых — догляд абеліска ў Сенненскім раёне. «Неклапрасію кіраўніцтва райвыканкама падказаць нам, дзе самы далёкі помнік, прысвечаны вайне, — гаворыць Аляксандр Мізаўцоў. — Вёскі там ужо не існуе. Штогод ездзім, фарбуем. Нам дапамагаюць супрацоўнікі пракуратуры, аддзела прымусовага выканання, аддзела судовых экспертыз. Сёлета навялі парадак у вёсцы Марозаўка, якая спазнала лёс Хатыні. Знакаміты Канстанцін Заслонаў загінуў на тэрыторыі Сенненскага раёна. І на гэтым месцы энтузіясты падтрымліваюць чысціню».

Суразмоўца распавёў і пра тое, як разам з калегамі дапамагае школьнікам з небагатых сем'яў перад пачаткам чарговага вучэбнага года. А яшчэ дзякуючы іх намаганням маламабезпечаныя сем'і з дзецьмі атрымліваюць салодкія падарункі да навагодняга свята.

Акрамя таго, Аляксандр — марафонец. Следчы ганарыцца, што адолеў дыстанцыю ў 10,5 км у Мінску. У наступным годзе плануе павялічыць адлегласць у два разы. Трэніруецца ўжо цяпер — кожная раніца ў афіцэра юстыцыі пачынаецца з прабежкі.

### Донар і краязнаўца

Напярэдадні чарговага дня донара Аляксандр Мізаўцоў прапанаваў калегам здаць кроў. Атрыманыя грошы патрацілі на падарункі тым людзям, якія жывуць ва ўстанове тэрытарыяльнага цэнтра абароны насельніцтва. Вельмі цікава гуляць у футбол з падлеткамі, якія выхоўваюцца ў школе-інтэрнаце. Там Аляксандр Вітальевіч з калегамі таксама бывае нярэдка.

А яшчэ яго хобі — краязнаўства. Ён прыдумаў ладзіць экскурсіі ў шматлікія месцы раёна. Ды і розныя ўстановы, вытворчыя памяшканні вельмі цікавыя для тых, хто там не працуе. А ў Сенненскім Доме рамёстваў следчыя ўдзельнічалі ў стварэнні ручніка. Гэты цікавы праект стаў вельмі рэзанансным. Шматметровы твор народнага мастацтва па традыцыях продкаў стварылі ўсе ахвотныя. Убачыць гэты рукатворны цуд можна было нядаўна на абласных «Дажынках» у Шуміліне.

За свой прафесійны шлях следчы расследаваў нямала крымінальных спраў. З найбольш гучных — у 2012 годзе мужчына захапіў у заложніцы жанчыну, якую пасля забіў. А ўнікальнай справай можна назваць расследаванне забойства мядзведзіцы. Як вядома, мядзведзь — чырванакніжны звер, адзін з сімвалаў фаўны Беларусі.

Суразмоўца вельмі цікава паразважаў над пытаннямі: як не стаць «сухаром» у прафесійным плане, пазбегнуць эмацыянальнага выгарання:

— Каб не быць робатам, механізмам, розныя сітуацыі трэба разглядаць шматгранна. Трэба паспрабаваць разабрацца: чаму чалавек учыніў парушэнне закона? Гэта, напэўна, дазваляе не стаць «сухаром», пазбегнуць памылак, — перакананы следчы.

На днях Аляксандру Мізаўцову прысвоілі чарговае званне — цяпер ён палкоўнік юстыцыі. «Звязда» далучаецца да віншаванняў!

Дынастыя

# Прафесія ў спадчыну

## Любоў да яе маладому спецыялісту перадалася ад бацькі



**Талачынскім раённым аддзелам Следчага камітэта кіруе Валерый Герасіменка, а ў Віцебскім гарадскім аддзеле сілавога ведамства служыць яго сын Уладзіслаў. Карэспандэнт «Звязды» сустрэўся з прадстаўнікамі працоўнай дынастыі і даведаўся, наколькі важна любіць справу, якой прысвяціў жыццё.**

### ХАЦЕЎ БЫЦЬ УРАЧОМ

І гэта нягледзячы на тое, што ў школе Валерый Герасіменка, старэйшы з дынастыі, марыў вывучыцца на медыка. Але пры паступленні ў ВНУ не хапіла ўсяго бала. Адслужыўшы ў арміі, зноў паспрабаваў набліізіцца да медыцыны, але, як высветлілася, за час службы крыху забыўся галоўныя для будучага медыка прадметы, у прыватнасці хімію.

Тым часам ужо ўчарашняму вайскоўцу прапанавалі паступіць у магілёўскую школу міліцыі. Пагадзіўся. Вучыўся два гады. У выніку разам з чырвоным дыпломам атрымаў спецыяльнасць юрыста.

— З самага першага дня службы ў міліцыі пачаў займацца следствам, — згадвае Валерый Герасіменка. — Прайшоў шлях ад следчага да намесніка начальніка РАУС. Потым перайшоў у Следчы камітэт. З 2013-га ўзначальваю аддзел.

У Валерыя двое дзяцей. Сыну ў лістападзе споўніцца 22 гады. Бацьку не можа не радаваць той факт, што ён — яго калега.

### З УЛІКАМ ВОПЫТУ

Усё часцей і ў глыбінцы даводзіцца раскрываць злачынствы, здзейсненыя ў сферы высокіх тэхналогій.

— Тэлефануюць быццам бы з банка і пачынаюць казаць аб тым, што з карткі грамадзяніна спрабавалі зняць грошы або здзейснілі нейкую іншую аперацыю (версій у махляроў шмат), — расказвае вопытны следчы. — Яны вельмі тонкія псіхолагі: так спрытна могуць весці размову, што чалавек перастае кантраляваць адказы і можа выдаць усё, што дазволіць невядомым скрасці грошы.

Валерый Герасіменка рэкамендуе ў такіх выпадках наогул спыніць размову. «На картцы ёсць нумар тэлефона, па якім можна патэлефанаваць і параіцца са спецыялістам, — кажа следчы. — А лепш за ўсё прыйсці ў найбліжэйшае аддзяленне банка і распавесці, што да вас тэлефанавалі махляры».

Улічваючы, што праз раён пралягаюць дзве трасы, ёсць нямала працы ў следчых і па раскрыцці дарожна-транспартных здарэнняў.

Неаднойчы супрацоўнікі раённага аддзела былі прызнаныя найлепшымі следчымі і настаўнікамі. «Кожны з маіх паважаных калег варты таго, каб пра яго напісалі асабіста», — упэўнены Валерый Герасіменка.

Між іншым, у вольны ад службы час яго падначаленыя даглядаюць месцы памяці, прысвечаныя вызваліцелям раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Акрамя таго, следчыя рэгулярна дапамагаюць сем'ям, у якіх выхоўваюцца прыёмныя дзеці.

### РАЗВАЖАННІ ПАЧАТКОЎЦА

Пра свайго бацьку 21-гадовы следчы Уладзіслаў Герасіменка гаворыць вельмі цёпла. З дзяцінства памятае, што ён позна прыходзіў з работы. Ганарыцца, што заслуга яго бацькі ў тым, што па вуліцах можна спакойна хадзіць, а гарадок сёння ўтульны для тутэйшых і гасцінны для прыезджых. Менавіта дзякуючы яму і вырашыў звязаць свой прафесійны лёс з праваахоўнымі органамі.

Сёлета Уладзіслаў паспяхова скончыў Акадэмію Міністэрства ўнутраных спраў. Аднак ужо за гэты кароткі час паспеў расследаваць некалькі злачынстваў. Найбольш запомнілася тое, якое мае дачыненне да захоўвання і распаўсюджвання наркотыкаў непаўналетнімі. Таксама малады чалавек раскрыў крадзеж тэлефона.

— Самае цяжкае ў працы следчага — вялікая нагрузка і шмат папер, якія трэба запаўняць, — прызнаецца Уладзіслаў Герасіменка.

Малады чалавек нярэдка працуе гадзінамі і пасля завяршэння працоўнага дня. Па яго словах, падчас следства нельга дапусціць памылкі, таму неабходна зрабіць правільныя захады да расследавання.

— Вядомы прынцып пра тое, што трэба сем разоў адмераць і адзін адрэзаць, — гэта пра нашу прафесію, — разважае следчы.

На дадзены момант хлопец з'яўляецца слухачом інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі Следчага камітэта Беларусі. Па яго перакананні, калі чалавек першы раз парушыў закон і не ўчыніў цяжкага злачынства, найбольш эфектыўна будзе пакараць яго не пазбаўленнем волі. «Ёсць вялікая верагоднасць, што чалавек гэта ацэніць і ў будучыні стане паважаць закон», — мяркуе Уладзіслаў.

Жаночы погляд

# З РАЗЛІКАМ НА МУДРАСЦЬ І ВОПЫТ

## Шматдзетная маці з Полацка расследуе складаныя крымінальныя справы



**Наталля ІВАШЧАНКА, якая служыць у Полацкім міжраённым аддзеле Следчага камітэта, выхоўвае траіх дзяцей. Карэспандэнт «Звязды» сустрэўся з ёй акурат напярэдадні Дня маці.**

### РОДАМ З ПОЛАЧЧЫНЫ

Надзвычай прыемны голас, цудоўнае пачуццё гумару, шчырае жаданне паказаць горад — гераіня выклікала сімпатыю яшчэ тады, калі дамаўляліся наконт інтэрв'ю па тэлефоне.

Калі ж сустрэліся, на пачатку размовы Наталля Міхайлаўна пажартавала, што звычайна пытанні задае яна. Цяпер жа на іх давялося адказваць самой.

Пакуль гутарылі з гэтай абаяльнай жанчынай, вельмі вясёлай, з дабрынёй у вачах, думаў, што калі б не ведаў, то наўрад ці і адгадаў, кім яна працуе. Акрамя ўсяго, яна мама траіх хлопчыкаў: Андрэя, Гардзея і Фадзея. Старэйшаму сыну дзевяць гадоў, яго братам — па шэсць і чатыры.

Наталля вельмі цёпла расказала пра сваю малую радзіму — пасёлак Фарынава Полацкага раёна. Мама яе працавала рабочай, бацька быў кіраўніком на розных пасадах. Да пераезду на Полаччыну кіраваў музычнай школай у Разані. У Беларусі ўзначальваў дрэваапрацоўчы комплекс, працаваў у калгасе, у аддзеле забеспячэння. Пра такіх кажуць — музыка ад Бога. Мясцовы гарманіст быў жаданым на святах землякоў. Дзякуючы яму і Наталля іграе на гармоніку.

З вялікай пяшчотай жанчына расказвала пра сваіх дзядулю і бабулю. Любоў да жыцця, павага да людзей, адсутнасць злосці — гэта пра іх. Наталлю і яе малодшага на два гады брата Івана старыя навучылі шмат чаму добраму.

### У ЮРЫСТЫ ПА ВОЛІ ЛЁСУ

Наталля Івашчанка здзівіла прызнаннем: у міліцэйскую ВНУ трапіла выпадкова. Сяброўка прапанавала паступіць за кампанію. Ды Наталлі пашанцавала, а ёй — не.

У выніку паспяхова скончыла Акадэмію Міністэрства ўнутраных спраў у Мінску, дзе вучылася на следча-экспертным факультэце. Па размеркаванні накіравалі яе на Полачыну. У Следчы камітэт трапіла адразу ж, калі яго стварылі. Дагэтуль міліцыі аддала каля дзесяці гадоў.

У следчай практыцы Наталлі былі перапынкі. Прычыны надзвычай сур'ёзныя: тройчы афіцэр юстыцыі знаходзілася ў дэкрэтным адпачынку. Муж гераіні публікацыі — таксама афіцэр. Ён — старшы оперупаўнаважаны ў міліцыі, займаецца вышукам злачынцаў.

Першая крымінальная справа, якую Наталлі давялося расследаваць, — хуліганства з удзелам пяці непаўналетніх. Гэта былі жыхары раёна ва ўзросце ад 14 да 16 гадоў.

— Нешта не падзялілі на дыскатэцы, — згадвае дэталі следчая. — Складанасць заключалася ў тым, што без бацькоў іх нельга было дапытаць, як і без педагога, а таксама падчас допыту абавязкова павінен прысутнічаць абаронца. Статус падазраванага ва ўчыненні злачынства непаўналетняга з'яўляецца для следчага важнай асаблівасцю, якая значна ўдакладняе следчыя дзеянні.

Расследавала Наталля Івашчанка і рэзананснае злачынства: мужчына гвалтаваў бабуль у іх жа жыллі, затым краў грошы. «Вельмі эмацыянальна цяжка было гутарыць з пажылымі людзьмі, — удакладняе афіцэр юстыцыі. — Увогуле, усе справы розныя. У кожнага — свой лёс: як у пацярпелых, так і ў злачынцаў. Тое, што паказваюць у сучасных серыялах пра следчых, не зусім адпавядае рэчаіснасці. Савецкія фільмы пра нашу дзейнасць больш праўдзівыя».

### У БАРАЦЬБЕ З НЯБАЧНЫМІ ЗЛАДЗЕЯМІ

Следчая ўжо мае вопыт і каманднага раскрыцця злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій. «Выбіраць не прыходзіцца: што даручаюць нам, тым і займаюся, — кажа Наталля. — У асноўным жа мая спецыялізацыя — цялесныя пашкоджанні, злачынствы супраць асобы».

Няўзброеным вокам відаць, што суразмоўца вельмі любіць сваю работу. Па яе словах, у прафесіі ёй дапамагае жаночая мудрасць ды тое, што яна — вопытная маці: жыццё навучыла адчуваць, калі нешта ўтойваюць, хлусяць. Шчыра прызнаецца, што часам няпроста расследаваць злачынствы, здзейсненыя жанчынамі, у якіх ёсць малыя дзеці. Часта шкадуе малых, якія вымушаны надоўга заставацца без маці.

Ці хацела б яна, каб яе нашчадкі таксама сталі праваахоўнікамі? Пра гэта пакуль не задумвалася.

— Галоўнае, каб яны знайшлі для сабе тыя прафесіі, дзе маглі б рэалізаваць свае здольнасці. Але самае важнае для чалавека — мець такія якасці, як дабрыня, павага да старых, разуменне таго, што трэба заступацца за малых, дапамагаць хворым, трэба быць патрыётам. Вучым іх з мужам не ленавацца і працаваць рукамі, напрыклад, на нашай дачы, — разважае шматдзетная маці.

Не сумняваюся, што яе дзеці, калі вырастуць, будуць менавіта такімі, як яна і яе муж, а сваякі змогуць ганарыцца імі.

Гучная справа

# ПАКАРАННЕ ПРАЗ ДЗЕСЯЦІГОДДЗІ

## Расследаваць забойства 20-гадовай даўнасці дапамагла экспертыза пахавых слядоў

**Пра рэзананснае групавое забойства двух маладых мужчын і іх равесніцы ў Віцебску, якое праз дваццаць гадоў раскрылі пры ўзаемадзеянні з расійскімі і нямецкімі экспертамі, распавёў Алег АСІПОЎСКІ, следчы па асабліва важных справах аддзела па расследаванні злачынстваў супраць асобы і грамадскай бяспекі ўпраўлення Следчага камітэта па Віцебскай вобласці.**



### Следчы яшчэ з... арміі

Да таго, як пачаць працаваць у Віцебску, Алег Асіпоўскі жыў у Оршы. Вучыўся ў каледжы на юрыста. Затым маладога чалавека прызвалі ў армію.

У войску Алег служыў у 52-м асобным спецыялізаваным пошукавым батальёне Міністэрства абароны. Менавіта дзякуючы гэтым ваеннаслужачым ажыццяўляецца пошук астанкаў вайскоўцаў Вялікай Айчыннай вайны, высвятляюцца імёны і прозвішчы тых, хто загінуў падчас ваенных дзеянняў, у тым ліку мірных грамадзян, якія сталі ахвярамі акупантаў і іх памагатых. Пошукавікамі шмат зроблена для ўвекавечання памяці нашых продкаў. Сваю лепту ў гэтую высакародную справу ўнёс і герой публікацыі.

Менавіта ў арміі Алег Асіпоўскі пачаў сваю пошукавую дзейнасць. Следчая спецыялізацыя — гэта працяг яго лёсу, прафесійнай рэалізацыі, кар'еры.

Пасля службы ў войску суразмоўца вучыўся на аддзяленні юрыдычнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага універсітэта імя П. М. Машэрава. Падчас вучобы служыў у Аршанскім аддзеле Дэпартамента аховы Міністэрства ўнутраных спраў. У Следчым камітэце — з моманту ўтварэння сілавога ведамства. Пачынаў у Оршы. Пяць гадоў Алег Юр'евіч працуе ва ўпраўленні Следчага камітэта па Віцебскай вобласці. З жонкай Галінай выхоўвае траіх дзяцей: двух сыноў — Глеба і Захара, а таксама дачку Ніку.

Пра такіх, як Алег Асіпоўскі, кажуць: прафесіянал высокага ўзроўню. Ад яго ведаў, вопыту, настойлівасці залежыць здзяйсненне непазбежнасці пакарання, колькі б гадоў ні прайшло з дня ўчынення злачынства.

### Дэталі трагедыі

Чалавек, якога, дзякуючы прафесіяналізму Алега Асіпоўскага і яго калег, асудзілі на доўгі тэрмін — 24 гады, вельмі хітры. Калі б не карпатлівая праца следчых, ён і дагэтуль мог бы ўваходзіць у давер наіўных людзей, жыць за чужы кошт, учыняць крадзяжы, забіваць...

— Злачынства адбылося ў Віцебску ў прыватным сектары, дзе ў адным з дамоў жылі муж з жонкай, іх непаўналетняя дачка, сын, які напярэдадні вярнуўся з арміі, і яго жонка, — згадвае дэталі крымінальнай справы следчы. — Гаспадары дома былі звычайнымі рабочымі, не прадпрымальнікамі, не сваякамі «моцных свету», не выйгралі ў латарэю.

Вярнуўшыся дахаты 9 снежня 2001 года пасля работы, мужчына ўбачыў кроў. У падвале ён знайшоў цела забітага сына, яго жонкі, а таксама іх суседа, які, як высветлілася пазней, зайшоў па рыдлёўку, каб пачысціць снег у двары каля сваёй хаты. Праз некаторы час дадому прыйшлі з работы і вучобы астатнія жыхары.

Ахвяры трагедыі — муж з жонкай — не пражылі разам і паўгода. Перад смерцю іх звязалі праводамі, шалікамі. Зброяй забойстваў былі сякеры, рыдлёўкі, рашпіль, малаткі...

Забойцаў было некалькі. Той, пра якога распавёў следчы, прывабны малады мужчына каля сарака гадоў. І можна так сказаць, што не толькі ў натоўпе, але і пры вельмі блізкіх стасунках пра такіх і не падумаеш, што яны «ў аўтарытэце» ў крымінальным свеце. Асуджаны родам з Калмыкіі. Парушаў закон яшчэ ў падлетковым узросце. У 1987 годзе быў асуджаны на радзіме за крадзяжы. Праз некалькі гадоў за разбойныя напады атрымаў тэрмін ужо ў Віцебску — за ўзброенае нападзенне.

### Выйшлі на іншае злачынства

У мужчыны былі чатыры судзімасці за жудасныя забойствы некалькіх чалавек у Віцебску. Следчыя ўстанавілі: у тым жа 2001 годзе ён забіў маладую жанчыну ў Расонскім раёне, да 2002 года пазбегнуў пакарання, хаваючыся ў сябе на радзіме. Аднак усё ж такі быў затрыманы ў Беларусі.

— Вельмі быў дзёрскі чалавек, — кажа Алег Асіпоўскі. — Фарбаваў валасы ў розныя колеры, быў хітры, лёгка ўваходзіў у давер, асабліва да жанчын.

Судзімы, дарэчы, не меў ніводнага тату. Верагодна, каб адпавядаць вобразу «добрага, клапатлівага, пяшчотнага, вернага» для чарговай жанчыны, якая хацела з ім жыць...

Следчы паказаў фота асуджанага. Калі б я не ведаў, што гэта твар жорсткага забойцы, махляра, падумаў бы, што вельмі прыветлівы і адэкватны чалавек. Фота з месца, дзе знайшлі трупы, паказвае яго сапраўдную сутнасць.

### Пахучы код... На гэтым «пракалоўся»

Яго віну не маглі даказаць амаль доўгіх сем гадоў. Ды і ў пачатку 2000-х магчымасці экспертызы былі ў разы слабейшыя, чым у апошні час.

З 2002 да 2019 год (!) мужчына адсядзеў чарговы раз. Яго затрымалі адразу пасля вызвалення. Каб даказаць віну ў трайным забойстве, было зроблена шмат экспертыз: крыміналістычных, дактыласкапічных, генетычных і іншых. Некаторыя былі праведзены і ў Германіі, і ў Маскве.

Верагоднасць таго, што менавіта ён учыніў злачынства, была максімальна набліжаная да ста працэнтаў. Выдаў злачынцу пахавы след. Ён унікальны! Абумоўлены генетычна. Верагоднасць супадзення пахаў у дваіх людзей такая ж малая, як ідэнтычнасць ДНК. Не можа быць аднолькавых пахаў нават у блізнят.

Што цікава, у залежнасці ад узросту, захворванняў, якія былі перанесены, ужываемых лекаў, змены рацыёну харчавання, фізічных нагрузак, як растлумачылі ў маскоўскім экспертным цэнтры, нішто не змяняецца, калі гаварыць пра пах, на працягу жыцця. У кожнага з нас ёсць так званы пахучы код. Ён застаецца на ўсім, на прыладзе злачынства ў тым ліку. У нашай сумнай гісторыі кроў забітых стала «вакуумам», у якім захаваўся пах. Верагодныя памылкі даследавання — адзін са ста мільёнаў выпадкаў!

Следчыя ўстанавілі, што ў забойстве бралі ўдзел яшчэ мінімум два чалавекі. Сярод жывых іх ужо няма. Аднак у пачатку расследавання крымінальнай справы не маглі даказаць дачыненне гэтых людзей да забойства.

Асуджаны атрымаў пакаранне. Падчас расследавання высветлілася, што злодзей незадоўга да затрымання набыў пісталет, пры дапамозе якога мог учыніць шмат злачынстваў. Нават самыя блізкія не маглі здагадацца, што сярод іх жыве не проста злодзей, а крымінальны геній.

Расследаванне яшчэ працягваецца. Усе нюансы забойства пакуль не могуць быць апублікаваныя.

**Матэрыялы падрыхтаваў Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
**Фота з архіва УСК па Віцебскай вобласці.**

## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, BELTORGI.BY

Продавец: **ОАО «Брагинский КБО»** (УНН 400032430), 247632, Гомельская область, г. п. Брагин, ул. Советская, 31. Тел./факс: +375 232 31-59-72 / 25-26-63, тел. +375 29 135-78-72

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **28 ноября 2021 г.** с **09.00 до 17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY**.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС (20 %) |
|---|---|---|
| 1 | Стиральная машина «Атлант 70С87», 2010 г. в., инв. № 14 | 100,00 |
| 2 | Гладильный станок Primus, 2010 г. в., инв. № 136 | 4200,00 |
| 3 | 1. Капитальное строение, инв. № 343/С-95628, пл. 107,8 кв. м, административное здание. 2. Капитальное строение, инв. № 343/С-95629, пл. 382,4 кв. м, здание мастерской. 3. Капитальное строение, инв. № 343/С-95630, пл. 56,1 кв. м, здание пилорамы. 4. Капитальное строение, инв. № 343/С-95631, пл. 350,5 кв. м, здание столярного цеха. 5. Капитальное строение, инв. № 343/С-95632, пл. 609,5 кв. м, здание склада стройматериалов. 6. Капитальное строение, инв. № 343/С-95633, пл. 409,2 кв. м, здание цеха стройматериалов. 7. Оборудование в количестве 5 ед. 8. Асфальтное покрытие, 48 кв. м. Кадастровый номер земельного участка 320382890601000399. Местонахождение: Гомельская обл., Брагинский р-н, Комаринский с/с, г. п. Комарин, ул. Ленина В. И., 4А | 41406,50 |
| 4 | Машина лесная погрузочно-транспортная «Беларусь» МПТ-461.1 в составе: трактор колесный категории «А», рег. № ЕК-3 0923, модель «Беларусь-Л82.2», заводской № 72002129, 2014 г. в., двигатель марка Д-243, № 855070; полуприцеп с гидроманипулятором, рег. № ЕК-3 0924, модель «ПЛ-9», зав. № 1139, 2014 г. в. | 43200,00 |
| 5 | Комплект для банкетного зала (3 стола), 2013 г. в., инв. № б/н | 234,00 |
| 6 | Мягкий уголок, 2013 г. в., инв. № 300022 | 513,00 |
| 7 | Мягкий уголок, 2013 г. в., инв. № 300025 | 603,00 |
| 8 | Холодильник 2823-XXX ЗАО «Атлант» РБ, 2010 г. в., инв. № б/н | 162,00 |
| 9 | Комплект оборудования для организации рабочего места по оказанию парикмахерских услуг, 2010 г. в., инв. № 413 | 657,00 |
| 10 | Комплект оборудования для организации рабочего места по оказанию парикмахерских услуг, 2010 г. в., инв. № 300033 | 657,00 |
| 11 | Сушуар, 2008 г. в., инв. № б/н | 144,00 |
| 12 | Место для маникюра, 2010 г. в., инв. № 300034 | 54,00 |
| 13 | Кресло детское, 2010 г. в., инв. № б/н | 63,00 |
| 14 | Комплект оборудования для мытья волос, 2010 г. в., инв. № 186 | 1062,00 |
| 15 | Кресло парикмахерское на подъемном механизме, 2005 г. в., инв. № б/н | 90,00 |
| 16 | Стол приемщика, 2009 г. в., инв. № 300026 | 81,00 |
| 17 | Стеллаж, 2009 г. в., инв. № 300027 | 63,00 |
| 18 | Стеллаж, 2009 г. в, инв. № б/н. | 63,00 |
| 19 | Шкаф-витрина, 2009 г. в., инв. № 300028 | 108,00 |
| 20 | Шкаф-витрина, 2009 г. в., инв. № 300029 | 108,00 |

**Местонахождение – п. 1–2 – Гомельская обл., г. п. Брагин, ул. Советская, 31, п. 4–20 – Гомельская обл., г. п. Комарин, ул. Ленина, 21.**

Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.

**Для участия в торгах необходимо** в срок с 09.00 18.10.2021 г. по 17.00 16.10.2021 г.: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, уплатить аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее рабочих 10 дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано а газете «Звязда» от 09.09.2021 г.

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного аукциона

| Предметы торгов | Начальная цена, руб. (без учета НДС) | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|
| Лот: **передвижная компрессорная станция ММЗ-03-ПВ,** год выпуска 2011 г., инвентарный номер 913 | 8 100,00 | 810,00 |

**Продавец:** КУП «БрестОблУкс», 224005, г. Брест, ул. Наганова, 10, тел./факс 80162 35 00 81. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». **Р/с для перечисления задатка:** р/с BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245. **Срок заключения договора купли-продажи:** не позднее 10 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Условия продажи:** без условий. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона компенсирует расходы на проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Шаг аукциона:** 5 % от предыдущей названной цены

**Аукцион состоится 03 ноября 2021 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона www.ocenkabrest.by, также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 02 ноября 2021 г. до 17.00**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Белслучь» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже одним лотом имущества в составе:**

- **МАСТЕРСКАЯ общей площадью 682,3 кв. м с инв. № 644/С-57252;**
- **ДОМ МЕХАНИЗАТОРА общей площадью 34,4 кв. м с инв. № 644/С-57253.**

**Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 625080800001000008 (право постоянного пользования) площадью 0,4197 га по адресу: Минская область, Солигорский район, Долговский с/с, 2, район д. Желтый Брод.**

**Начальная цена** с НДС (20 %) – **76 320,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **7 632,00** бел. руб.).

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: ограничение прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах линий связи и радиофикации, пл. 0,0019 га; земельные участки, расположенные в придорожных полосах автомобильных дорог, пл. 0,4197 га.*

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 4 (четырех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **17.11.2021** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **16.11.2021** до **16.00** по указанному адресу в каб. 320.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11. Тел. для осмотра: 8 (0174) 272-383, 8 (029) 377-81-98.**

УНП 600071222

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона, оператор ЭТП** | **ООО «Расантехторг», г. Минск, ул. Беды, 33, помещение 339. Адрес ЭТП: www.torgi24.by** |
| **Продавец** | **ОАО «Столбцовский РКБО» Минская область, г. Столбцы, ул. Я. Коласа, 28** |

**Предмет электронных торгов**

| Лот | Наименование (назначение), инвентарный номер | Начальная цена с НДС (бел. руб.) |
|---|---|---|
| 809 | Промышленная швейная машина 1022 класса (г. Орша) в комплекте с рабочим столом – 10 шт. | 1400,00 |
| 810 | Промышленный оверлок ZOJE ZJ 757A-516M – 3 шт. | 1470,00 |
| 811 | Швейная машина (пуговичная) – ZOJE ZJ373 – 1 шт. | 900,00 |
| 812 | Швейная машина (петельная) ZOLE ZJ781 | 1680,00 |
| 813 | Швейная машина ZOjE - ZJ5300 | 500,00 |
| 814 | Гладильный стол Futura Maxi C5 | 500,00 |
| 815 | Гладильный стол Легмаш | 200,00 |
| 816 | Шиномонтажный стенд ОМА | 1500,00 |
| 817 | Станок балансировочный АФ-11 Сторм | 1000,00 |
| 818 | Подъемник 2-стоечный гидравл. Flying | 2500,00 |
| 819 | Станок 3К 634 точильно-шлиф. | 1200,00 |
| 820 | Станок сверлильный 380 В | 200,00 |
| 821 | Мотоблок с приспособлениями | 600,00 |

**расположенные по адресу:** Минская обл., Столбцовский р-н

**Размер шага** составляет **5 %** от начальной цены лота

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета торгов в белорусских рублях (**для каждого лота**) перечисляется на р/с BY56UNBS30120893600010000933 в ЗАО «БСБ Банк», код UNBSBY2X, г. Минск, пр-т Победителей, 23/3, УНП 191514793, получатель: ООО «Расантехторг»

**Срок подписания договора купли-продажи: 5** (пять) рабочих дней после торгов

**Условия оплаты предмета торгов**

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на проведение торгов и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **10 %** от цены продажи лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Затраты на организацию и проведение торгов составили: по лоту (для каждого лота) – не более **650,00 бел. руб.**

**Дата и время начала торгов**: **17.11.2021** с 9.00 до 16.00

Для участия в торгах необходимо подать заявку и пройти регистрацию в качестве участника торгов на торговой площадке: **www.torgi24.by**. Прием документов на участие в торгах осуществляется организатором торгов ООО «Расантехторг» на электронную почту: **info@torgi24.by**. Срок приема заявлений на участие в торгах и оплаты задатка – с 16.10.2021 по 15.11.2021 с 9.00 до 17.00

**Контактные данные: +375 (29) 607-79-50; +375 (29) 607-22-87. E-mail: info@torgi24.by.**

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона)

извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества

**ОАО «Торфопредприятие Глинка» (Продавец)**

### Лота № 1: АВТОВЕСОВАЯ,

инв. № 135/С-14578, 141 кв. м,
Брестская обл., Столинский р-н, Радчицкий с/с,
д. Колодное, ул. Заводская, 2/3.

Земельный участок 125885201601000115, 2,6560 га.

Начальная цена с НДС – 40 135,54 руб. Задаток – 4 013,55 руб.
Шаг аукциона – 5 %. Штраф – 5 000,00 руб.

**Аукцион состоится 29.10.2021 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.**

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», БИК BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений и задатков – 27.10.2021 в 11.00.

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, в том числе не завершенных строительством жилых домов, сроки консервации и завершения строительства которых истекли, с одновременной продажей права заключения договора аренды земельного участка**

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63

**Лот № 1.** Не завершенный строительством законсервированный жилой дом с инв. № 255/U-13026, наименование – бетонный фундамент, назначение – здание одноквартирного жилого дома (процент готовности 10 %: фундамент – бетон, площадь застройки – 62,0 кв. м) и земельный участок с кадастровым № 220887024601000083, площадью 0,2478 га в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома по адресу: Витебская обл., Браславский р-н, Плюсский с/с, д. Красногорка, 22 А. Ограничения: водоохранные зоны водных объектов вне прибрежных полос (озеро Снуды), охранные зоны линий электропередачи напряжением до 1000 В.

**Начальная цена предмета аукциона** (в т. ч. не завершенный строительством жилой дом/земельный участок), руб.: **3065,71** (2024,95/1040,76) бел. руб. Задаток: 306,00 бел. руб. Удельный вес стоимости не завершенного строительством жилого дома в начальной цене предмета аукциона – 66,05 %

**Лот № 2**. Не завершенный строительством законсервированный жилой дом с инв. № 255/U-13058, наименование – бетонный фундамент, назначение – здание одноквартирного жилого дома (процент готовности 10 %: фундамент – бетон, площадь застройки – 62,0 кв. м) и земельный участок с кадастровым № 220887024601000082, площадью 0,2498 га в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома по адресу: Витебская обл., Браславский р-н, Плюсский с/с, д. Красногорка, 22Б. Ограничения: водоохранные зоны водных объектов вне прибрежных полос (озеро Снуды), охранные зоны линий электропередачи напряжением до 1000 В.

**Начальная цена предмета аукциона** (в т. ч. не завершенный строительством жилой дом/земельный участок), руб.: **3218,74** (2169,58/1049,16) бел. руб. Задаток: 321,00 бел. руб. Удельный вес стоимости не завершенного строительством жилого дома в начальной цене предмета аукциона – 67,40 %

**Дата, время и место проведения аукциона: 16.11.2021 в 11.45** по адресу: Витебская обл., Браславский р-н, г. Браслав, ул. Советская, 119 в Браславском районном исполнительном комитете. **Срок внесения задатка и приема документов: с 8.30 18.10.2021 до 15.00 15.11.2021. Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** ***Задаток перечисляется на р/с: BY70 AKBB 3600 3120 7000 7000 0000 ОАО «АСБ Беларусбанк» ЦБУ № 205, БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: Главное управление Министерства финансов Республики Беларусь по Витебской области.***

**Условия для победителя аукциона либо единственного участника**: в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся: внести плату за предмет аукциона и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и представлением документации, необходимой для его проведения; в течение двух месяцев со дня утверждения в установленном порядке протокола аукциона обратиться в РУП «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за гос. регистрацией прав на зем. участок, а также за внесением в ЕГРНИ в отношении присвоения адреса земельному участку с кадастровым № 220887024601000083 и не завершенному строительством законсервированному капитальному строению с инв. № 255/U-13026 (лот № 1); в течение двух месяцев со дня утверждения в установленном порядке протокола аукциона обратиться в РУП «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за гос. регистрацией прав на зем. участок, а также за внесением в ЕГРНИ в отношении присвоения адреса земельному участку с кадастровым № 220887024601000082 и не завершенному строительством законсервированному капитальному строению с инв. № 255/U-13058 (лот № 2); получить в установленном порядке разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и строительство объекта, разработать проект на строительство объекта в срок, не превышающий 6 месяцев; к строительству жилого дома приступить после согласования в установленном порядке проектной документации; осуществить строительство объекта в сроки, установленные действующим законодательством. **Назначение зем. участков** в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 09 02 – размещение объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Инженерные коммуникации и сооружения на земельном участке отсутствуют. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией

**Аукцион проводится в порядке, установленном Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 № 220. Для участия в аукционе приглашаются** граждане РБ, консолидированные участники (двое и более граждан РБ), которые в установленный в извещении срок подают заявление об участии в аукционе с указанием предмета аукциона, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином РБ – копия документа, удостоверяющего личность; представителем гражданина РБ – доверенность, оформленная в соответствии с требованиями законодательства; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе и доверенность. Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников в отношении каждого предмета аукциона. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением документации, необходимой для его проведения, перечисляются на р/с, указанный в протоколе аукциона. Расходы, связанные с изготовлением документации, составляют 699,28 бел. руб. Информация об окончательных суммах затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходах, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, письменно доводится до сведения участников перед началом проведения аукциона. Всем участникам предоставляется право ознакомления с документацией, а также возможность осмотра на местности предмета аукциона. **Конт. тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.**

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона

Предмет торгов – Лот:
1) изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-61492 (наименование: швейная мастерская; назначение: помещение бытового обслуживания населения) площадью 47,5 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Пинский р-н, Пинковичский с/с, д. Пинковичи, ул. Лунинецкая, 182-4;
2) изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-61490 (наименование: аптека; назначение: помещение здравоохранения) площадью 18,4 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Пинский р-н, Пинковичский с/с, д. Пинковичи, ул. Лунинецкая, 182-1;
3) изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-61491 (наименование: магазин; назначение: торговое помещение) площадью 378,8 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Пинский р-н, Пинковичский с/с, д. Пинковичи, ул. Лунинецкая, 182-2

| Начальная цена, руб. (с учетом НДС) | 123 120,00 | Размер задатка, руб. | 12 312,00 |
|---|---|---|---|

**Продавец:** ф-л ПМК-58 ОАО «Пинскводстрой», Брестская обл., Пинский р-н, д. Пинковичи, ул. Березовая, 3, тел./факс 80165 67 34 19. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». **Р/с для перечисления задатка:** р/с BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245. **Срок заключения договора купли-продажи:** не позднее 10 рабочих дней с даты подписания протокола аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Условия продажи:** без условий. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона компенсирует расходы на проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Шаг аукциона:** 5 % от предыдущей названной цены. **Обременение:** наличие действующих договоров аренды

**Аукцион состоится 16 ноября 2021 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона www.ocenkabrest.by, также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00

**Последний день приема заявлений – 15 ноября 2021 г. до 17.00**

# «І ГОРА БЫЛО ТАКІМ МОЦНЫМ, ШТО ПЕРАДАЛОСЯ ПРАЗ ГЕНЫ»

## Малінаўку спалілі цалкам, у Мікалаеўцы — асобныя хаты

Бялыніцкі раён вельмі пацярпеў ад фашыстаў. Па словах галоўнага спецыяліста аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Бялыніцкага райвыканкама Ірыны Бляўцавай, гітлераўцы знішчылі болей чым семдзясят вёсак.

**З КНІГІ «ПАМЯЦЬ» БЯЛЫНІЦКАГА РАЁНА:**

*Масавае знішчэнне мірнага насельніцтва Бялыніцкага раёна, якое практыкавалася акупантамі з першых дзён вайны, асабліва шырока вялося ў час карных экспедыцый, калі разам з людзьмі знішчалі цэлыя вёскі. Найбольш буйныя з іх «Майкефер» («Майскі жук») і «Адлер» («Арол») правялі ў чэрвені-жніўні 1942 года ў вёсках Барок, Каменка, Карманаўка, Кулакоўка, Рубеж, Эсьмоны, Брэнькаў, Сныткі, Вугольшчына, Пільшычы. Было спалена 360 хат, загінула 217 чалавек. 16 лютага 1943 года была знішчана вёска Малінаўка — спалена 27 двароў, забіта каля сотні жыхароў, палова з якіх дзеці...*

Відавочцаў тых страшных ваенных часоў ужо няма. Некалькі гадоў таму памерла апошняя цётка Ларысы Клімянок, якой на пачатак вайны было 13 гадоў. Няма болей і вёскі з прыгожай назвай Малінаўка, якую немцы спалілі разам з жыхарамі. Суседка Ларысы Клімянок Ніна Бялова пераехала ў Мікалаеўку з Малінаўкі ў сямідзясятыя гады. Пасля вайны была спроба аднавіць там жыццё, але не атрымалася. Зараз у Малінаўцы толькі вялікая брацкая магіла — агульная на ўсіх забітых сялян. Да вайны жыхары Мікалаеўкі і Малінаўкі вельмі цесна сябравалі. Таму было і шмат шлюбаў паміж вясковай моладзі.

— Мая маці Вера Міхайлаўна Ільюшына родам з Мікалаеўкі, а бацька — з Малінаўкі, — расказвае Ніна Бялова. — Бацькаву радню ўсю цалкам спалілі — усіх пяцярых братоў. Дзеда Міхаіла Міхайлавіча, у якога стаялі партызаны, карнікі прывязалі да каня і гналі да Пясчанкі некалькі кіламетраў, а там дабілі. Бацька быў у партызанах, таму і жывы застаўся.

— У Малінаўцы згарэла старэйшая сястра майго бацькі — Наста, — дзеліцца сямейнай трагедыяй Ларыса Клімянок. — Немцы не паглядзелі, што яна цяжарная і з шасцігадовым сынам, спалілі і яе, і хлопчыка. Наста на Вугалі жыла, праз лес трэба было ісці, але цётка яе пашкадавала, не адпусціла ў ноч. А раніцай у вёску прыйшлі карнікі, усіх сагналі ў гумно і там спалілі.

— У Мікалаеўцы таксама шмат людзей знішчылі, — узыхае суразмоўца. — Дзеда Аўласа, старых бацькоў Невядомскіх, Апатавых... Яны проста па вуліцы ішлі, а немцы па іх стралялі. Ніхто не ведае, за што забівалі, за што палілі...

## Жыхароў папярэджвалі ратавацца



Школьнікі запісваюць на дыктафон успаміны Ларысы КЛІМЯНОК.

Дзявочае прозвішча Ларысы Уладзіміраўны — Каленціёнава. Такое ж было ў яе зводных братоў і сястры — Аляксандра, Рэгіны і Анатоля. Пра тое, як іх забівалі разам з маці, яна шмат разоў чула ад бабулі.

— Бацька быў у партызанах, у атрадзе Асмана Касаева, — расказвае суразмоўніца. — Перад тым як здарылася няшчасце, ён папярэдзіў сям'ю пра планы немцаў. Зваў жонку Феню ў лес. Яна адмовілася, сказала, што іх там у лесе акружаць і паб'юць, а мы застанёмся ў вёсцы. Дзеці зусім малыя былі: малодшаму два гады, старэйшаму — сем. Куды з такімі ў лес, ды яшчэ зімой. Бацька вярнуўся ў атрад, а на наступны дзень немцы прыйшлі ў вёску. І ў Малінаўцы людзей папярэджвалі. Хто ўцёк, жывы застаўся. Вунь цётцы Ганне Іонавай хутка 90 гадоў, у яе болей чым 10 дзяцей было. Муж запрог каня, пасадзіў іх на калёсы і ў лес завёз. А тых, хто не стаў уцякаць, немцы потым сагналі і спалілі.

Агульнае, што аб'ядноўвае Ларысу Уладзіміраўну з людзьмі, якіх яна, па сутнасці, ніколі не бачыла, — бацька. І гора было такім моцным, што праз гены перадалося і ёй. Як толькі пачынае ўспамінаць тыя жахі, слёзы коцяцца градам. І вядзе да таго самага месца, дзе ўсё адбылося. Вунь тая яблынька, дзе калісьці стаяла стопка (хлеў без вокнаў). Гэта непадалёк ад яе дому, насупраць праз дарогу. Дом жанчыны стаіць усяго за некалькі метраў ад таго месца, дзе пакутнікі прынялі сваю смерць.

— Жанчыны вырылі ў стопцы лаз і схаваліся разам з дзецьмі, — расказвае Ларыса Уладзіміраўна. — Але не стала хапаць паветра, і дзеці заплакалі. Немцы пачулі, падышлі і сталі крычаць: партызан, вылазь. Але яны не паслухаліся. І немцы падпалілі стопку. Ад дыму жанчыны і дзеці задыхнуліся. Бабуля расказвала, што, калі немцы пайшлі, целы загінулых на санках перавезлі праз дарогу ў дом і паклалі ў радок. Яны белыя былі, нават не пачарнелі. А тут немцы зноў вярнуліся і пайшлі па хатах з аўтаматамі. Добра яшчэ, што бабуля сарыентавалася і пачала немцаў палохаць: «Пан, у нас тыф». Яны паглядзелі, што людзі белыя як мел ляжаць і хуценька збеглі з хаты. А перад домам яшчэ і вартавых паставілі, каб ніхто болей не заходзіў. Бабуліна хітрасць выратавала яе саму, яе дачку Зою і аднавяскоўцаў Хрысціну з Дуняй. Астатнія хаваліся, дзе прыйдзецца. Дзядзя Толя, бацькаў брат, тры дні сядзеў на елцы, пакуль немцы не сышлі. Дзеўкі ў Пясчанку збеглі, там перачакалі.

## Другая сям'я

Бацька Ларысы Клімянок моцна перажываў страту. Пахаваў жонку і дзяцей і далучыўся да дзеючай арміі. Вызваляў Магілёў, дайшоў да Польшчы. Пасля сур'ёзнага ранення трапіў у шпіталь у Днепрапятроўску. А пасля вайны вярнуўся дадому, ажаніўся з будучай маці Ларысы Уладзіміраўны. Час быў цяжкі, браўся за любую работу, каб хоць нешта зарабіць. І ў кузні шчыраваў, і мост у Лямніцы будаваў, і касіў, і паляводам быў. Ад той хаты, дзе калісьці жыла яго сям'я, нічога не засталося. Адно печышча. Разам з новай жонкай пабудавалі побач з ім новае жытло. Потым прыбудову зрабілі, дзе і вырасцілі сваіх чацвярых дзяцей. Калі тыя дарослыя ўжо былі, дабіліся, каб ім фінскі дом далі, потым абклалі яго цэглай.

Сваю першую сям'ю мужчына ніколі не забываў. Дзесяць гадоў таму пахаванне ўзялі на ўлік мясцовыя органы ўлады. Цётка Зоя, якая была відавочцам той трагедыі, напісала заяву ў райвыканкам, дзе расказала ў падрабязнасцях усё, як было. Пахаванню быў нададзены ахоўны статус. За дзяржаўныя і прыватныя грошы зрабілі помнік, агароджу, паклалі бардзюр.

— А мы даглядаем, кветкі носім, — кажа Ларыса Уладзіміраўна. — Бацька па сваіх забітых дзецях сумаваў усё жыццё, прасіў і яго каля той магілы пахаваць. Мы так і зрабілі.

У Ларысы Клімянок сваіх трое дзяцей, адзін сын, на жаль, ужо пайшоў з жыцця. Астатнія жывуць далёка — на Гомельшчыне. Яна таксама там жыла, але вярнулася на радзіму даглядаць маці. Калі тая памерла, засталася ў бацькоўскай хаце. Тым больш што яшчэ жывая была цётка Зоя, трэба было ёй дапамагаць. Некалькі гадоў таму памерла і яна, апошняя з бацькавага роду. Нічога асабліва ўжо і не трымае яе на гэтым месцы, але мяняць яго не хочацца. Вось толькі сэрца стала часцей хварэць і збівацца з рытму. Вельмі шмат прыйшлося за блізкіх людзей перажываць.

— Калі пачынаю расказваць унукам пра тое жыццё, яны толькі адмахваюцца, кажуць, ды ты бабуля казкі гаворыш, — узыхае жанчына. — Зараз самой часам здаецца, што ўсё тое мне прыснілася. Вельмі цяжка жылі. Памятаю пах хлеба, які бацька прыносіў з горада. Маці пасыпле яго цукрам — і няма лепш ласунку. Аднойчы дзядзька, які працаваў у шахце, прывёз шакаладных цукерак, «Стэпныя» называліся. Раздаў дзецям па чатыры штучкі. Я свае паклала і не чапала. Толькі разгарну, панюхаю, паліжу і зноў схаваю. Потым малодшаму брату аддала, самаму маленькаму. Так і не пакаштавала. Вайна адабрала ў людзей не толькі родных, але і дзяцінства ў малых.

### Кампетэнтна

**Галоўны спецыяліст аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Бялыніцкага райвыканкама Ірына БЛЯЎЦАВА:**

— У сувязі з аднаўленнем даследавання аб масавых знішчэннях мірных грамадзян мы падалі ў пракуратуры ўсе зафіксаваныя факты. У раёне працуе камісія, якая займаецца гэтымі пытаннямі. Яшчэ раз прайшліся па дварах, апыталі нашчадкаў. Выявілі адзіны новы факт, але ён не звязаны з генацыдам. Жыхары паведамілі пра пахаванне партызана ў лесе. Зараз вырашаецца пытанне аб перапахаванні загінулага. Усяго ў раёне 124 воінскія пахаванні, у тым ліку 12 звязаных з генацыдам. Усе яны зарэгістраваныя ўпраўленнем па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў Узброеных Сіл Беларусі. Нумары пашпартоў гэтых пахаванняў размешчаны ў нас на сайце. Пахаванне, дзе знаходзяцца знішчаныя фашыстамі дзеці і жанчыны з вёскі Мікалаеўка, значыцца ў нас пад лічбай 7218.

**З КНІГІ «ПАМЯЦЬ» БЯЛЫНІЦКАГА РАЁНА**

*З акта камісіі Бялыніцкага раёна па ўстанаўленні і расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў і іх пасобнікаў ад 4 снежня 1944 года.*

*Нямецкія акупанты расстралялі 1471 жыхара, у тым ліку 467 жанчын і 270 дзяцей. Спалілі 215 чалавек, у тым ліку 65 жанчын і 86 дзяцей. Загналі ў рабства 1569 чалавек, з якіх 664 жанчыны. Усяго расстраляна, павешана, спалена і сагнана ў рабства 3315 чалавек. Пры ўскрыцці ям было ўстаноўлена, што людзі былі распранутыя да споднягa, рукі звязаныя, шмат у каго выбітыя зубы.*

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
*Бялыніцкі раён.*
**Фота аўтара.**

### У тэму

**Пётр ХАВАНСКІ, старшыня ваенна-пошукавай секцыі рэспубліканскага таварыства аховы помнікаў, член абласной камісіі па генацыдзе:**

— Наша галоўная задача — выхаваць у моладзі пачуццё патрыятызму. Прычым сапраўднага, а не штучнага. Такія тэмы не могуць нікога пакінуць абыякавымі. Пра гэты страшэнны факт я даведаўся каля 11 гадоў таму, калі была жывая яшчэ цётка Ларысы Клімянок — Зоя, відавочца тых падзей. Я ёй і параіў звярнуцца ў райвыканкам. Мяне яе гісторыя моцна ўзрушыла. І я вырашыў прывезці сюды моладзь. Каб маладыя людзі таксама перажылі тыя адчуванні, што і я. Наша задача — даць моладзі дакрануцца да тых падзей і пачуць тыя жахлівыя гісторыі з першых вуснаў.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

# ДУХОЎНАЯ ЕДНАСЦЬ

## Уклад у будучыню, пасланне новым пакаленням

**Фінал рэспубліканскай міжканфесійнай дабрачыннай акцыі «Аднаўленне святынь Беларусі. Нас аб'ядноўвае гісторыя і вера» прайшоў у сталіцы ў Храме-помніку ў гонар Усіх Святых і ў памяць аб ахвярах, якія паслужылі выратаванню нашай Айчыны.**

У Год народнага адзінства праект быў рэалізаваны пад слоганам «Нас аб'ядноўвае гісторыя і вера». Валанцёры руху БРСМ «Добрае Сэрца» сумесна з прадстаўнікамі канфесій Беларусі добраўпарадкавалі 341 святыню — храмы, касцёлы, крыніцы, помнікі і абеліскі вайсковай славы.



Фота БелТА.

«Працоўныя акцыі накіраваны на тое, каб кансалідаваць моладзь праз духоўную агульнасць. Каб праз асабісты ўдзел у будаўніцтве, добраўпарадкаванні святынь, храмаў, праз добрыя справы моладзь атрымлівала духоўна-маральнае выхаванне, — сказаў **першы сакратар ЦК БРСМ Аляксандр ЛУК'ЯНАЎ**. — Гэта ўклад у будучыню, пасланне новым пакаленням. Працуючы на тэрыторыі святынь, маючы стасункі са святарамі, хлопцы і дзяўчаты далучаюцца да рэлігіі, закладваюцца каштоўнасныя асновы, якія ў перспектыве становяцца «засцерагальнікамі» ад здзяйснення жудасных, бесчалавечных рэчаў».

Многія гады фінал праекта праходзіў 14 кастрычніка — у Пакроў Прасвятой Багародзіцы і Дзень маці. У гэтым годзе арганізатары вырашылі адрадзіць традыцыю, прычым сімвалам фінальных мерапрыемстваў акцыі абраны ручнік — заступнік і абаронца. Унікальны рукатворны сімвал прэзентаваў па адкрыцці навучэнец 8 класа Семежаўскага вучэбна-педагагічнага комплексу дзіцячы сад — сярэдняя школа імя М. С. Высоцкага Раман Волкаў.

Усяго ў Мінску на фінал сабраліся каля 70 найлепшых прадстаўнікоў валанцёрскага руху БРСМ «Добрае Сэрца» з рэгіёнаў краіны.

Моладзь дапоўніла новымі саджанцамі яблыневую алею, закладзеную валанцёрамі БРСМ на тэрыторыі храма-помніка, абнавіла малюнак на дызайнерскай лаве, устаноўленай у 2018-м падчас дабрачыннай акцыі Саюза моладзі «Час дабра». Хлопцы і дзяўчаты наведалі з экскурсіяй музей памяці і крыпту, паўдзельнічалі ў майстар-класах «Роднае-народнае».

Цэнтральным мерапрыемствам фіналу стаў міжканфесійны дыялог «Нас аб'ядноўвае гісторыя і вера» з удзелам прадстаўнікоў асноўных канфесій Беларусі. Юнакі і дзяўчаты змаглі атрымаць адказы на хвалюючыя пытанні ад экспертаў.

Прыемным сюрпрызам для «добрых сэрцаў» стала цырымонія ўручэння падзяк ад Беларускай праваслаўнай і Беларускай каталіцкай цэркваў.

Добрыя справы акцыі на гэтым не скончыліся. Валанцёры — курсанты Інстытута пагранічнай службы — у гэты ж дзень добраўпарадкавалі тэрыторыю шматфункцыянальнага комплексу Дома міласэрнасці.

Рэспубліканская міжканфесійная акцыя «Аднаўленне святынь Беларусі», ініцыятарам якой з 2013 года выступае БРСМ, спрыяе ўмацаванню міжканфесійнага і нацыянальнага адзінства.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# «Я — МАТЧЫН СПЕЎ, Я — МАТЧЫНЫ ТРЫВОГІ...»

## Што пісалі беларускія класікі пра самага дарагога чалавека?

**Кажуць, што слова «маці» зразумелае на ўсіх мовах свету... Недарэмна мы называем беларускую «матчынай мовай» — маючы на ўвазе, што яна самая родная...**
**На жаль, сённяшнія маці, асабліва гарадскія, не заўсёды спяваюць сваім дзецям беларускія калыханкі... Але слынныя нашы літаратары, чыім стылем мы захапляемся, звычай свой моўны скарб назапашвалі менавіта ў сям'і. І, карыстаючыся ім, стваралі вобраз маці — адзін з самых яркіх у нашай літаратуры... Давайце згадаем некаторыя з гэтых вобразаў.**


Максім Танк з маці.

### ТАЯ, ШТО СПЯВАЕ КАЛЫХАНКІ

Янка Купала дакладна чуў беларускія калыханкі ад сваёй маці, Бянігны Іванаўны, лежачы ў калысцы ў Вязынцы. Маці спявала вельмі прыгожа, ведала шмат легенд і казак. А ў п'есе «Паўлінка» выкарыстаны рэальны факт з яе жыцця: маці Бянігна, або, як звалі ў сям'і, Боні, была супраць, каб дачка выходзіла замуж за беднага арандатара Дамініка Луцэвіча. І тады, са слоў пляменніцы Купалы, «аднаго разу палеглі ўсе спаць, а Боня сабрала свае сукенкі, яшчэ нешта сваё і праз акно выскачыла ў сад. Там яе ўжо Луцэвіч чакаў...»

Маці Купалы была прыгожай, ураўнаважанай, маўклівай, Купала, па водгуках, быў вельмі падобны да яе і знешне, і па характары. Бянігна Іванаўна загінула ў 1942-м у акупаваным Мінску, праз два дні пасля гібелі свайго сына ў лесвічным пралёце маскоўскага гатэля. На Вайсковых могілках у Мінску на помніку Бянігне Луцэвіч выбіты радок з верша яе сына: «Навучыўся я слоў беларускіх ад маці...»

Шмат у якіх творах Купала заклікае жанчын выхоўваць дзяцей у любові да свайго:

*Ты гадуй сынка, матуля,*
*У пялёнкі спавівай,*
*Калышы, пей люлі-люлі,*
*Пей пацішу баю-бай!*
*Над калыскай з бегам ночак*
*Песні роднай не жалей,*
*Каб, як вырасце сыночак,*
*Верным вечна ён быў ей.*
*Як навучыцца хадзіці,*
*Маткі мову разумець,*
*Ты вучы яго любіці,*
*Ўсё сваё ў пашане мець.*
*Бай яму даўнейшы казкі,*
*Аб бацьках сваёй зямлі,*
*Як жылі без чужой ласкі,*
*Як слугамі не былі.*

Верш напісаны ў 1918 годзе, калі надзвычай важным было пытанне беларускай дзяржаўнасці і нацыянальнай самасвядомасці. Не страціў верш актуальнасці і дасюль.

### ТАЯ, ШТО ЎСЁ ПРАБАЧАЕ

У Змітрака Бядулі шмат цудоўных апавяданняў, прысвечаных маці, напрыклад, ён апісвае рэальны выпадак, як маці несла яго, хворага, да доктара на руках праз зімовы лес. Ці апавед пра жанчыну з мястэчка, якая, каб здабыць грошы на ежу для дзяцей, пагадзілася на здзеклівае выпрабаванне — прайсці па распаленых цаглінах. Але адно з самых кранальных апавяданняў — «На каляды к сыну». Старая Тэкля, бедная ўдава, жыве толькі радасцю з таго, што любы сын Лаўручок выбіўся ў людзі, недзе ў горадзе стаў адвакатам: «Во хто сядзіць у яе грудзях, як верабей у цёплым гняздзе». Калі Тэкля зусім састарэла і занядужала, вырашыла ўсё ж выправіцца ў горад да свайго Лаўручка... Знайшла неяк яго дом, назвалася лёкаям...

*«— Лаўручок мой! Сынок! — як непрытомная, кінулася да яго Тэкля...*

*— Роднен...*

*Ён раптам пачырванеў, паглядзеў на слуг ды хрыпла крыкнуў:*

*— Чаму вы пускаеце ў такой розных жабрачак шалёных?!*

*— Ідзі! ідзі! — звярнуўся ён да яе глуха, адрывіста,— ідзі, старушка! Я цябе... не знаю...*

*— А сынок мой, а Лаўручок ты мой! Маткі сваёй не пазнаеш?! Гэта ж...*

*Ён бразнуў дзвярамі і пайшоў у пакоі...*

*Той самы лёкай выправадзіў яе за дзверы...»*

Вось і вынік таго, калі не прытрымліваюцца маці купалавай парады, не гадуюць дзяцей у любові і павазе да сваёй культуры, да ўласнага роду... Добра, што гэта апавяданне ўваходзіць у школьную праграму — сумленне трэба выхоўваць з дзяцінства.

### ТАЯ, ШТО СПЯВАЕ ПЕСНІ

Аркадзь Куляшоў, вундэркінд, які ў шаснаццаць гадоў ужо меў паэтычны зборнік, вырас у сям'і настаўнікаў. Маці, Кацярына Ратабыльская, была беларускай, а вось бацька з італьянскімі каранямі — яго продкам быў італьянец-арганіст. У доме гучала шмат музыкі, меўся патэфон... Паэт пазней успамінаў: «Мая маці не спявала толькі тады, калі вяла ўрокі ў школе».

Зразумела, першыя паэтычныя спробы Аркадзя былі падтрыманы дома... Хоць выхоўваць будучага паэта было няпроста. Дачка Аркадзя Куляшова Валянціна згадвала, што калі таму было чатыры гады, ён, каб адпомсціць даросламу суседу, падпаліў яго хату. Пачаўся пажар, у якім згарэла ледзь не палова вёскі. Можаце ўявіць, што перажыла тады Кацярына Куляшова?

У паэта шмат вершаў, якія ўспяваюць маці... Часта можна пачуць баладу пра гераіню, якая ператварылася ў камень, каб сын мог вярнуцца з вайны дадому. А вось гэты верш, напісаны ў 1963-м, хоць і з грамадзянскім гучаннем, але вельмі асабісты:

*Я хаце абавязаны прапіскаю —*
*Калыскаю, падвешанай пад столь.*
*Я маці абавязан кожнай рыскаю,*
*Драўлянай лыжкаю, глінянай міскаю —*
*Усім, чым працы абавязан стол.*
*Я — матчын спеў,*
*я — матчыны трывогі,*
*Я — матчын гнеў, які ўставаў на ногі,*
*Гнаў смерць на Захад —*
*у нару з нары —*
*Трацілаваю пугай перамогі.*
*Дыміліся сямі франтоў дарогі*
*За мной, як дынамітныя шнуры.*
*Пазбавіўшы ад гразнага вёдовішча*
*Свет, не дазволю я, каб дым і пыл*
*Зямлю ператварыў у бамбасховішча,*
*Мільярд прапісак — у маўклівы прысак,*
*Мільярд калысак — у мільярд магіл.*

### ТАЯ, ШТО ЗАЎСЁДЫ СУСТРАКАЕ

Адну са сваіх кніг Рыгор Барадулін падпісаў так: «Маёй зязюльцы шэрай, маёй любай маме — ад сына Грышы». Мала ў каго з паэтаў была такая духоўная лучнасць з маці, як у Рыгора Барадуліна — з Кулінай Андрэеўнай Барадулінай. Ён запісваў ад яе песні і выслоўі, адну са сваіх кніг назваў — «Евангелле ад мамы». У прадмове да сваёй кнігі «Вушацкі словазбор» пісаў: «Мама перадала мне найвялікшы дар — мову нашую крывіцкую з вушацкай падсветкай, з вушацкім прысмакам». Калі пачалася вайна, бацька Рыгора пайшоў на фронт, Куліна гадавала сына адна, даводзілася хавацца ў лесе ад карнікаў — «Дзякуй, што ў блакаду цягала, як сваё кацянятка кошка»... Потым, калі муж з фронту не вярнуўся, сама падымала сыночка, «абшывала як не ўсю Вушачу, а сама была плюшаўцы рада».

Верш «Завошта?» паэт напісаў пасля смерці любай матулі:

*Бывала, калі прыязджаў раньком,*
*На патэльні скварыліся скваркі,*
*Як грэшныя душы ў пекле.*
*Калі прыязджаў удзень,*
*З бакоўкі на стол не спазняліся*
*Паўднёвішне малако*
*У ручацілку з адтапыранаю губой*
*І масла (каб не растаць ад радасці)*
*У хустачцы з лісцінкі капуснай.*
*Калі прыязджаў апоўначы,*
*Грукаў у шыбіну цёмную,*
*І зоркай калядную*
*Пад столлю загаралася лямпачка,*
*Гатовая загаварыць,*
*Намучыўшыся ў цемрыве.*
*Цяпер, калі б я ні прыязджаў,*
*Сустракае*
*То нясмелай яшчэ травою,*
*То спасаўскім яблыкам,*
*То здрыжэлым апошнім лістом,*
*То ганарыстым снегам*
*Вечная маміна хата.*
*А мама сама не выйдзе.*
*Завошта дагэтуль*
*На сына ў крыўдзе?*
*Я ведаю...*

### ТАЯ, ШТО НЯСТОМНА ПРАЦУЕ

Маці Максіма Танка, Домна Іванаўна, таксама неперажывалася за сына... Яшчэ б: у 1914 годзе з двухгадовым сынам Жэнем на руках адправілася ў бежанства ўглыб Расіі... Потым, ужо ў родных мясцінах, пад уладаю панскай Польшчы давялося бачыць, як жандары хапаюць сына проста на іх хутары, збіваюць прыкладамі, прывязваюць на вяроўку да фурманкі і валакуць у турму за ўдзел у беларускім падполлі... Танк успамінаў, як маці з крыкамі бегла за ім, пакуль не ўпала. У творчай спадчыне паэта сярод вершаў пра маці працуем гэты:

***Рукі маці***

*Іх цалавала зямля*
*Сваімі пясчанымі вуснамі і каласамі;*
*Неба спякотай, вятрамі, дажджамі*
*Іх цалавала.*
*Пража нямала*
*З іх выпіла ў ночы бяссонныя*
*Свежасці ранняй.*
*Колькі яны запалілі світанняў,*
*Зораў над намі.*
*Колькі сягоння на іх*
*Віднеецца чорных, глыбокіх*
*Шрамоў і маршчынаў,*
*Гэта сляды, што навекі пакінуў*
*Шлях наш суровы.*
*Толькі заўсёды,*
*Як мы зберымося дамоў*
*І на стол пакладзе рукі маці,*
*Быццам ад сонца,*
*ад іх пасвятлее ў хаце*
*І ў сэрцы.*

### ТАЯ, ШТО ВУЧЫЦЬ ПАЭЗІІ...

Маці паэтэсы Яўгеніі Янішчыц Марыі Андрэеўне давялося зведаць страшнае: яна перажыла сваю таленавітую дачку. Па вобразнай, паэтычнай мове гэтай простай сялянкі было зразумела, адкуль у Жэні талент. І калі ў чацвёртым класе Жэня напісала свой першы верш, то прысвяціла яго менавіта Марыі Андрэеўне. І потым не адзін твор прысвяціла маці, апісваючы яе нялёгкую долю. Бацьку Жэні закатавалі за дапамогу партызанам. Маці абшывала вёску, каб зарабіць капейчыну...

*Позна класціся. Рана ўставаць.*
*Рана ўставаць — не бяліца:*
*Па-над загонамі шчыраваць,*
*Па-над калыскай маліцца.*
*У чарадзе праліўных нядзель —*
*Не прапусціць ярыбочка...*
*Кароткі, як шчасце, уходжаны дзень,*
*Яшчэ карацейшая — ночка.*
*Дыхае вольнымі мама грудзьмі,*
*Калі вяртаемся з поля.*
*Ушчувае: «Драціну з дарогі здымі —*
*Іншаму ног не наколе».*
*Кажа: «Ападзіны дол замялі.*
*Выткаўся жнівень раскошны.*
*Здымі сандалікі, не бойся зямлі,*
*Не бойся, дзіцятка, пожні...»*

*Прыеду. Кветка чакання ў акне*
*Міргае-цвіце ў адзіноце.*
*А вершы баюся чытаць,*
*каб мяне*
*На глухой не злавіла ноце*
*Мама — мая паэтэса.*

### ТАЯ, ШТО АХВЯРУЕ САБОЙ

У паэта Анатоля Сыса ёсць незвычайны верш «Неапаленая купіна» з такой вось вялікай прадмовай:

*«Калі я быў малы, дык часта думаў, чаму ў мяне маці такая старая і непрыгожая, а адночы адважыўся запытацца пра яе шнары на твары, якія глыбока ў душы любіў, якія тысячы разоў цалаваў.*

*— Ох, сынок мой! Гэта ж здарыўся пажар, і яшчэ з адной жанчынай абгарэлі крэпка. Жанчына тая памерла. І ў мяне былі абпаленыя і рукі, і грудзі, і твар... І была я цяжарная табою, сынок мой, і ўсе казалі, гэта я даведалася потым, што ці я памру, ці дзіця нарадзіцца мёртвым. Аж нарадзіла я цябе, сынок мой, жывенькага, толькі на твары была чырвоная плямінка. Я думала, след ад пажару, аж аклямаўся ты трохі, і яна знікла, сынок мой. А была я прыгожая да пажару. Ды хіба ў непрыгожай маці мог нарадзіцца такі сынок мой?»*

Гэта рэальная гісторыя, у якой паэт бачыў сімволіку. Свой першы паэтычны зборнік назваў «Агмень». А верш «Неапаленая купіна» гучыць так:

*Як святарны абраз,*
*людзі вынеслі маці з пажару,*
*бы вужаку, маланку аддзёрлі*
*ад белых грудзей,*
*каб сусіцьшыць пакуты,*
*паклалі пад цёмную хмару*
*і, каб смагу спатоліць,*
*размову вялі аб вадзе,*

*а яшчэ гаварылі:*
*Пярун выбірае шчаслівых.*
*маці верыла людзям, на шчасце,*
*цяжарная мной,*
*і шаптала замову: калюжыны —*
*гадам вашывым,*
*полю жытняму — дожджык,*
*а рэчка — крывінцы маёй...*

*Бы вужака, маланка смактала*
*у полымя грудзі*
*і плявала адрыжкі*
*на самых прыгожых жанчын,*
*Неапалёнай Купіне — маці —*
*маліліся людзі,*
*і пачуў я ва ўлонні:*
*з пакуты народзіцца Сын...*

*Неапалёнай Купіне — маці —*
*малюся адзінай,*
*я ўсмактаў з малаком і любоў,*
*і праклёны яе:*
*хто плюе на жанчыну —*
*той нелюдзь плюе на Радзіму,*
*хто гандлюе святыняй —*
*той маці сваю прадае.*

### ТАЯ, ШТО НАТХНЯЕ НА ЗМАГАННЕ

Вельмі пяшчотныя адносіны з маці былі ва Уладзіміра Караткевіча. Марыя Васільеўна скончыла Марыінскую гімназію ў Магілёве, і калі Караткевічу трэба было працаваць у раманах штосьці на французскай мове, звяртаўся да яе. Менавіта знойдзены ў матчыным радаводзе сваяк, Тамаш Грыневіч, паўстанец 1863-га, расстраляны ў Рагачове, натхніў Караткевіча шмат на якія сюжэты... Маці была для Караткевіча ўзорам жанчыны, адно са сваіх першых апавяданняў, «Багун», прысвяціў ёй. А першы зборнік назваў «Матчына душа». Калі маці была старэнькай, забраў яе ў Мінск, у пісьменніцкі дом на Карла Маркса, 36. Адам Глобус, чыя сям'я жыла з сям'ёй Караткевічаў у адным пад'ездзе, успамінаў, як Караткевіч на кожнай лесвічнай пляцоўцы прымацаваў крэсла, каб маці магла адпачываць, спускаючыся ці падымаючыся. У п'есе «Маці ўрагану» гераіня адметная... Агна Вецер, удава, хоча падбухторыць сына на помсту за абражаны гонар сям'і. Але сын, які толькі што з'яднаўся з любай дзяўчынай, не знаходзіць у сабе сіл рызыкаваць жыццём... Агна пасылае яго ў пячору да жабрака, які выяўляецца пракажоным. Цяпер Васіль Вецер упэўнены, што ён смяротна хворы, і можа адчайна змагацца. Агна — самы нязломны персанаж п'есы, рухавік Крывіцкага паўстання:

*«Агна. Мы — панцырныя баяры. Мы храбрасцю ў войнах здабылі сабе права нікому не цалаваць рукі і насіць меч...»*

І ў фінале, пасля таго як паўстанне разбітае, апошнія гучаць словы да Агны Вецер:

*«Голас. Маці. Пачуй нас. Не чуеш? Маці ветру. Маці ўрагану! Чорта яны нас узялі! Чорта лысага яны ўзялі і возьмуць нас! Заслона».*

Трэба дадаць, што Уладзімір Караткевіч памёр у дзень нараджэння сваёй маці.

Перачытайце яшчэ раз цудоўныя творы беларускіх класікаў, і не забудзьце сказаць добрыя словы ўласным маці!

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

Вернісажы

# САЛОН КЛАПАТЛІВЫХ,

## альбо Пра кошт і цану нашага мастацтва

**Чаго больш за ўсё не хапае моладзі для поўнага шчасця? Грошай — першае (і не самае арыгінальнае), што прыходзіць на думку, калі завітваеш на выстаўку-продаж твораў маладых мастакоў «Восеньскі салон з Белгазпрамбанкам — 2021». Але тут самае галоўнае не забываць пра тое, што першае ўражанне бывае падманлівым. Праўда, аматары гэтых выставак ужо даўно ведаюць, што лічбы побач з творамі — гэта не нумары тэлефонаў. Прытым спецыялісты не губляюць імпэту разважаць пра каштоўнасць мастацтва (калі гэта мастацтва). А маладыя мастакі, паставіўшы нясціплыя (па абывацельскіх мерках) лічбы каля сваіх работ, пры гэтым, як ні дзіўна, спрабуюць даказаць: не ў грошах шчасце. А ў чым тады? І тут ёсць варыянты. Іх пошук стаў сёлета асаблівым клопатам аўтараў, якія прайшлі адбор журы і атрымалі магчымасць выставіцца ў Палацы мастацтва. Такім чынам, адчуваем некалькі поглядаў на шчасце...**





### 1. Прафесійны

Любімая справа — клопат першы і галоўны для тых, хто выбірае творчыя прафесіі. І для маладых мастакоў адпаведна. Бо калі яны тут (а некаторыя ўдзельнічаюць рэгулярна, пастаянна, пакуль дазваляе ўзрост ад 18 да 40 гадоў), гэта значыць, для іх важная магчымасць ствараць, і яны вельмі імкнуцца знайсці сваю публіку. Дарэчы, неабавязкова маладую — сведчыць цікавасць да выстаўкі з боку прадстаўнікоў розных пакаленняў, якія сочаць за праектам з самай першай выстаўкі.

— Вельмі прыемна, што сёлета шмат маладых мастакоў даслалі свае прапановы, свае творы, імкнуліся стаць удзельнікамі гэтага мастацкага праекта, — адзначае **кандыдат мастацтвазнаўства і адзін з арганізатараў выстаўкі Аляксандр ЗІМЕНКА.** — Калі ў 2015 годзе пачынаўся першы «Восеньскі салон», то напачатку гэта было хутчэй жаданне мець у Мінску такую пляцоўку, якая давала б магчымасць сустракацца мастакам, прафесіяналам, аматарам мастацтва і людзям, якія яго для сябе адкрываюць. Мінула шэсць «Салонаў» — цяпер мы ладзім сёмы і бачым, што сустракацца тут стала для нас добрай звычкай.



Сёлета арганізатары атрымалі амаль дзевяць соцень лістоў ад мастакоў. На выстаўцы-продажы ў Палацы мастацтва прадстаўлення 420 твораў 178 аўтараў, з якімі можна пазнаёміцца да канца кастрычніка. І не толькі пазнаёміцца, але і, можа быць, паўплываць на чыйсьці творчы лёс: звычайна на «Восеньскіх салонах» выбіраюць пераможцаў, якія атрымліваюць пэўныя матэрыяльныя выгоды. Гледачы таксама раней маглі паўплываць на вынік праз галасаванне за аўтараў, якія спадабаліся. Цяпер задача для гледачоў ускладняецца: трэба не проста напісаць тры прозвішчы мастакоў, чые творы ўразілі, але і адзначыць іх баламі ад аднага да трох. Гэта значыць, выстаўку прыйдзецца глядзець пільна і вельмі добра падумаць, чые творы найбольш падабаюцца/уражваюць.

### 2. Атмасферны

«Восеньскі салон» — гэта знаёмства не толькі з аўтарамі, але ў нейкім сэнсе і з самімі сабой. І гэта яшчэ адзін важны клопат, адчувальны. Партрэты (часам нават надзвычай рэалістычныя), пейзажы (о, родныя краявіды, якое без вас жыццё?!), абстрактныя работы, арт-аб'екты, відэаарт — ва ўсім ёсць адбітак энергіі, у якой мы варымся. На жаль, у мастацкіх твораў немагчыма памераць пульс, а то было б цікава назіраць, як пры аглядзе выстаўкі лінія ідзе стабільна роўна — работы ў праверaных традыцыйных тэхніках, — але гэта славуты грунт беларускага мастацтва, у якім адчуваецца пэўны настрой. І сёлета ў выставачнай прасторы ён адыгрывае сваю знакавую ролю. Але ідзеш далей, і час ад часу рыска пульса скокне ўверх: небанальны твор, і думка пульсуе, каб яго расчытаць. Бо цяпер творца можа стварaць вобраз не толькі фарбамі, але і пры дапамозе падручных сродкаў, напрыклад, пластыкавых пакетаў, бінтоў, прутоў і іншых матэрыялаў, якія яшчэ не так даўно складана было б аднесці да сродкаў мастацкага выяўлення. Але жыццё падкідвае ідэі творцам, а яны як радары ўлоўліваюць іх і трансфармуюць у творы, падобныя на згусткі энергіі. І гэта можа быць не толькі арыгінальна, трапна, разумна. Гэта можа быць эфектна і прыгожа. Не кажу пра тое, што карысна. Пагадзіцеся, больш прыемна бачыць не бездакорна роўную лінію сэрцабіцця, а ўсё ж з перыядычнымі ўсплёскамі. Што гэта значыць, мы ж усе разумеем: дзе б'ецца пульс, там ёсць жыццё.

— У Палацы мастацтва можна не толькі паглядзець на саміх сябе, але і ўбачыць выдатны зрэз мастацкіх твораў у розных жанрах і кірунках, — адзначае **першы намеснік старшыні Беларускага саюза мастакоў Наталля ШАРАНГОВІЧ:** — Тут мы даём магчымасць гаварыць моладзі. І гэта вельмі здорава, таму што сябе паказвае новае пакаленне, а мы можам прачытаць яго думкі.

— Натхняе, што ёсць моладзь, якая робіць адкрыцці, імправізуе, — пагадзіўся **намеснік па выставачнай дзейнасці Беларускага саюза мастакоў Андрэй БАСАЛЫГА.** — Хачу нагадаць, што праз некалькі гадоў мы пачнём жыць у другой чвэрці XXI стагоддзя, а гэта выклік.

### 3. Перспектыўны

— «Восеньскі салон з Белгазпрамбанкам» за час свайго існавання ператварыўся ў буйны выставачны праект года ў Рэспубліцы Беларусь, — адзначае **дырэктар Палаца мастацтва Аляксандр ЗІНКЕВІЧ.** — Асноўная задача — адкрываць новыя імёны і даваць старт іх творчасці. Кожны раз мы на трэць абнаўляем гэты спіс. Праз «салон» ужо прайшло больш за 3,5 тысячы заявак маладых мастакоў. За гэтыя сем гадоў выставілася амаль тысяча аўтараў, а гэта ўнікальны набытак і падстава для гонару, што творчая актыўнасць у Беларусі ўзрастае.

Але не менш важны клопат — публіка, яе ўключанасць у мастацтва, імкненне да гармоніі. І задачу па выхаванні густу ніхто не адмяняе. Ды і мастакі, як бы ні імкнуліся да самавыяўлення, скіраваныя на публіку. Яны не ствараюць «для сябе». Гэта вельмі адчуваецца па работах на выстаўцы: тых, якія прызваны спадабацца (і быць прададзенымі), і тых, якія падобныя на згусткі чыстай энергіі і задаюць тон усёй выстаўцы, і па тых, якія фарміруюць настрой, нагадваючы што мы ўсе — жывыя людзі са сваімі марамі, памкненнямі, надзеямі. Галоўная з іх — захаваць сябе для будучыні, паказаць, наколькі плённым можа быць шлях самаразвіцця, асабліва калі ён памножаны на безліч падобных шляхоў. Тады перспектыва адкрываецца не аднаму, не двум. Клопат аб перспектыве яднае людзей. Такім чынам, клопат аб перспектыве мастацтва важны не толькі для мастацтва.

Паводле слоў арганізатараў, папярэднюю вялікую выстаўку ў Палацы мастацтва «Арт-Мінск» наведала 28,5 тысячы гледачоў: нам гэта патрэбна. Істотная падрымка і матывацыя, каб далей ладзіць падобныя мерапрыемствы. Удзел у такіх вялікіх праектах, як «Арт-Мінск» і «Восеньскі салон» — выклік для мастакоў, каб быць у тонусе і развівацца. Гэта праява энергіі жыцця — што можа быць больш каштоўным?

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

**Фота Аліны МАЗАВЕЦ.**

# «КАЛІ МЫ ЎСЕ РАЗАМ ЛЯЦІМ ДА ЗОР»

## Паштоўку з партрэтам Максіма Багдановіча адправілі ў космас

**Выява паэта, які апеў зорку Венеру, апынулася ў космасе... Калісьці супрацоўнікі літаратурнага музея Максіма Багдановіча прэзентавалі гэтую паштоўку з партрэтам самага рамантычнага беларускага паэта журналістцы АНТ Святлане Карульскай, а тая, у сваю чаргу, перадала яе беларускаму касманаўту Алегу Навіцкаму. Вось такое вялікае падарожжа атрымалася ў звычайнай паштоўкі. Загадчык музея Максіма Багдановіча Міхал БАРАНОЎСКІ дапамог «Звяздзе» даведацца аб дэталях гэтай літаратурна-касмічнай навіны:**



— Ірына Мацяс, супрацоўніца нашага музея, калі перадавала паштоўку, звярнула ўвагу на радкі, размешчаныя на адваротным баку. А гэта верш Максіма Багдановіча «Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы...», напісаны ў 1915 годзе. Лірычны зварот, у якім ідзе развага аб ролі чалавека ў кантэксце сусвету: «Нашто ж на зямлі // Сваркі і звадкі, боль і горыч, // Калі ўсе мы разам ляцім // Да зор?» Святлана Карульская праявіла ініцыятыву і перадала пасылку касманаўту Алегу Навіцкаму як сімвал Радзімы. Ідэя зрабіць так, каб Максім мог апынуцца бліжэй да зор, пра якія так марыў, даўно лётала ў паветры, але ўсё не было нагоды яе рэалізаваць, а тут зоркі сышліся, і праз тры поціскі рукі верш Максіма апынуўся на арбіце. Мы былі ў курсе справы і ўважліва сачылі за навінамі, і вось, нарэшце, наша маленькая мара збылася.

Так беларуская літаратура распаўсюджваецца па ўсім сусвеце. Дарэчы, традыцыя касманаўтаў браць з сабою ў космас нейкія асабліва важныя для іх кнігі існуе даўно — хоць гэта вельмі складана, бо кожны грам грузу ўлічваецца. Але ў 1984 годзе на борце карабля «Саюз Т-10» пабывала кніга «Апошнія вершы М. Ю. Лермантава», якраз тады, калі аднаму з астэроідаў надалі імя гэтага паэта. Да стагоддзя Льва Талстога ў космас адправіліся «Севастопальскія апавяданні». Казахскі касманаўт Талгат Мусанбаеў узяў з сабой на станцыю Каран, расіянін Алег Рыжыкаў — Евангеле... Але яшчэ раней пабывала на касмічнай вышыні беларуская літаратура: касманаўт Уладзімір Кавалёнак у 1978 годзе ўзяў з сабой на арбітальную станцыю «Салют-6» паэтычны зборнік Васіля Зуёнка «Нача», захаваліся кадры, як ён чытае вершы адтуль на арбіце. Пётр Клімук браў з сабой кніжнае выданне «Новай зямлі», і гэты асобнік цяпер захоўваецца ў коласаўскім музеі ў Смольні. І касманаўт Алег Навіцкі, родам з Чэрвеня, ніколі не забываўся на сваю радзіму. Успомніце, як падчас святкавання Дня беларускага пісьменства ў Капылі мы змаглі ўбачыць на экране яго віншаванне землякам-беларусам. Тады ж ён з пачуццём прачытаў урывак з верша Максіма Танка «Рукі маці». А цяпер дзякуючы Алегу Навіцкаму на станцыі — паштоўка, з якой Максім Багдановіч глядзіць на Зямлю і на любімую Беларусь з космасу.

**Арына КАРПОВІЧ.**

# ПРАВИЛА РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

# «Выигрывай с Автобарахолкой Onliner и Mastercard 2»

Настоящие правила проведения рекламной игры (далее – Правила) разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), определяют порядок проведения рекламной игры «Выигрывай с Автобарахолкой Onliner и Mastercard 2» (далее – Рекламная игра).

В настоящих Правилах нижеперечисленные термины имеют следующие значения:

**Интернет-сайт Организатора** – размещенный в глобальной сети Интернет сайт (интернет-ресурс), расположенный по адресу: https://www.onliner.by.

**Пользователь** – физическое лицо, использующее интернет-сайт Организатора и соглашающееся с Правилами пользования ресурсом (https://blog.onliner.by/siterules).

**Учетная запись (профиль)** – хранимая в компьютерной системе совокупность данных о пользователе сайта, необходимая для его аутентификации и предоставления доступа к его личным данным и настройкам.

**«Банковская платежная карточка»** – платежный инструмент, обеспечивающий доступ к банковскому счету, счетам по учету банковских вкладов (депозитов), кредитов физического или юридического лица для получения наличных денежных средств и осуществления расчетов в безналичной форме, а также обеспечивающий проведение иных операций в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

**1. Организатор Рекламной игры**

1.1. Организатором Рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «Онлайнер», юридический адрес: 220069 г. Минск, пр-т Дзержинского, 5-613, зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190657494, свидетельство о государственной регистрации выдано Минским городским исполнительным комитетом 25.06.2014.

**2. Наименование Рекламной игры**

2.1. Настоящая Рекламная игра называется «Выигрывай с Автобарахолкой Onliner и Mastercard 2».

**3. Территория проведения Рекламной игры**

3.1. Рекламная игра проводится на территории Республики Беларусь.

**4. Сроки проведения Рекламной игры**

4.1. Рекламная игра проводится с 25.10.2021 по 31.12.2021 (включая период проведения розыгрыша, вручения призов и публикацию результатов проведения Рекламной игры).

**5. Цель проведения Рекламной игры**

5.1. Рекламная игра проводится в целях стимулирования реализации пакетных решений (https://ab.onliner.by/promote), представляющих собой услугу по премиальному продвижению размещенных пользователями на сайте Организатора рекламных объявлений в разделе «Автобарахолка» (https://ab.onliner.by), и стимулирования онлайн-платежей с использованием банковских платежных карточек международной платежной системы Mastercard Worldwide (исключение составляют карты Maestro и «Белкарт»/Maestro).

**6. Комиссия по проведению Рекламной игры**

6.1. Для проведения Рекламной игры Организатор создает комиссию по ее проведению (далее – Комиссия), осуществляющую контроль за соблюдением установленных Правил.

6.2. Состав Комиссии.

Председатель Комиссии:

- Кажуро Денис Петрович, ООО «Онлайнер», директор.

Члены Комиссии:

- Жуковец Илья Николаевич, ООО «Онлайнер», заместитель директора по развитию;
- Ляшкевич Никита Александрович, ООО «Онлайнер», заместитель директора – начальник отдела маркетинга;
- Назаренко Лилия Александровна, ООО «Онлайнер», маркетолог отдела маркетинга;
- Борейко Надежда Анатольевна, индивидуальный предприниматель, УНП 692153814 (Минская обл., Минский р-н, п. Юбилейный, ул. Тополиная, 2/1, кв. 9).

**7. Участники Рекламной игры**

7.1. Участник – физическое лицо, выразившее желание принять участие в Рекламной игре на условиях, предусмотренных в настоящих Правилах, являющееся зарегистрированным пользователем сайта https://www.onliner.by и выступающее в качестве держателя банковской платежной карточки Mastercard Worldwide (исключение составляют карты Maestro и «Белкарт»/Maestro).

7.2. В Рекламной игре могут принимать участие совершеннолетние граждане Республики Беларусь, а также совершеннолетние иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство в Республике Беларусь и постоянно проживающие на территории Республики Беларусь.

7.3. Участниками Рекламной игры не могут быть лица, состоящие в трудовых отношениях с Организатором, члены комиссии, супруг (супруга) таких лиц, их близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

7.4. Каждый участник может принимать участие в Рекламной игре неограниченное количество раз при соблюдении требований, предъявляемых к размещению рекламных объявлений на сайте Организатора, закрепленных в Правилах пользования интернет-ресурсом (https://blog.onliner.by/siterules), а также выполнении условий, приведенных в п. 8.1 настоящих Правил.

**8. Порядок участия в Рекламной игре**

8.1. Для участия в Рекламной игре Участник должен:

8.1.1. зарегистрировать на интернет-ресурсе https://www.onliner.by учетную запись (профиль) на заявленных администрацией сайта условиях (https://blog.onliner.by/siterules);

8.1.2. разместить в разделе «Автобарахолка» (https://ab.onliner.by) рекламное объявление о продаже/обмене автомобиля с соблюдением требований, приведенных в Правилах пользования интернет-ресурсом (https://blog.onliner.by/siterules);

8.1.3. подтвердить свое согласие на участие в Рекламной игре в панели управления учетной записи (профиля), при этом в специальных полях указать свои достоверные персональные данные – фамилию, инициалы либо имя и отчество (при наличии) полностью;

8.1.4. являться держателем банковской платежной карточки Mastercard Worldwide (исключение составляют карты Maestro и «Белкарт»/Maestro);

8.1.5. валидировать (привязать) к учетной записи (профилю) банковскую платежную карточку Mastercard Worldwide (исключение составляют карты Maestro и «Белкарт»/Maestro), которую пользователь планирует использовать для онлайн-оплаты услуг по премиальному продвижению своих рекламных объявлений, размещенных на сайте Организатора в разделе «Автобарахолка» (https://ab.onliner.by);

8.1.6. в период с 25.10.2021 по 05.12.2021 до 23:59:59 (включительно) приобрести на сайте Организатора любой из предложенных на выбор пользователям вариант пакетного решения (https://ab.onliner.by/promote), представляющий собой услугу по премиальному продвижению рекламных объявлений в разделе «Автобарахолка» (https://ab.onliner.by), воспользовавшись для этих целей валидированной (привязанной) к учетной записи (профилю) пользователя банковской платежной карточкой Mastercard Worldwide (исключение составляют карты Maestro и «Белкарт»/Maestro).

8.2. Информация об успешной оплате и приобретении услуги (ID-номер платежа) будет транслироваться Участнику на интернет-ресурсе https://www.onliner.by в панели управления учетной записи пользователя в разделе «Способы оплаты», подраздел «История пополнений и платежей», и станет доступна для просмотра с момента поступления денежных средств на счет Организатора.

**9. Призовой фонд**

9.1. Призовой фонд Рекламной игры сформирован за счет денежных средств и имущества Организатора в размере **8228** (восемь тысяч двести двадцать восемь) белорусских рублей **68** (шестьдесят восемь) копеек.

9.2. Призовой фонд Рекламной игры:

| | Наименование приза | Количество, шт. | Стоимость за ед., бел. руб. | Всего стоимость, бел. руб. | Ставка НДС | Сумма НДС, бел. руб. | Всего стоимость с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Приз | **Смартфон iPhone 12 Pro 128GB Pacific Blue, Model A2407, MGMN3RM/A** | 2 | 2999,15 | 5998,30 | 20 % | 1199,66 | 7197,96 |
| | денежные средства в размере | | 515,36 | 1030,72 | – | – | 1030,72 |
| **Итого:** | | | | | | | **8228,68** |

**10. Время и место проведения розыгрыша призового фонда Рекламной игры**

10.1. Розыгрыш призов осуществляется в 2 (два) тура в приведенном в таблице порядке:

| Номер тура | Дата и время проведения розыгрыша | Период, в течение которого Участник должен приобрести услугу | Срок подтверждения Участником согласия на участие в Рекламной игре | Количество призов тура |
|---|---|---|---|---|
| Тур 1 | 19.11.2021, в 12.00 | с 25.10.2021 по 14.11.2021 (23:59:59) включительно | не позднее 14.11.2021 (23:59:59) | 1 (один) приз |
| Тур 2 | 10.12.2021, в 12.00 | с 15.11.2021 по 05.12.2021 (23:59:59) включительно | не позднее 05.12.2021 (23:59:59) | 1 (один) приз |

Розыгрыш призового фонда будет проводиться в присутствии Комиссии по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, пр. Дзержинского, 5–613, ООО «Онлайнер».

10.2. Розыгрыш проводится среди Участников, надлежаще выполнивших условия участия в Рекламной игре, в соответствии с требованиями настоящих Правил.

**11. Порядок проведения розыгрыша призового фонда, в том числе порядок определения победителей Рекламной игры**

11.1. До момента проведения розыгрыша призов в каждом из туров Рекламной игры Комиссия формирует Список Участников Рекламной игры, успешно выполнивших все условия настоящих Правил. Список формируется по дате и времени приобретения Участниками на сайте Организатора пакетных решений (https://ab.onliner.by/promote), представляющих собой услугу по премиальному продвижению размещенных пользователями на сайте Организатора рекламных объявлений в разделе «Автобарахолка» (https://ab.onliner.by). Каждому Участнику в Списке присваивается свой порядковый номер, который является участвующим в розыгрыше Игровым кодом. Нумерация Игровых кодов начинается с 1 (единицы).

11.2. Список включает в себя следующую информацию о допущенных к розыгрышу Участниках: номер Игрового кода Участника; ID-номер платежа Участника; дату и время совершения платежа Участником; дату и время подтверждения Участником желания принять участие в Рекламной игре; фамилию, инициалы либо имя и отчество (при наличии) Участника полностью.

11.3. Для проведения розыгрышей используется лототрон, состоящий из одной секции, и набор шаров в количестве 10 штук с номерами от 0 до 9.

11.4. Определение выигрышного Игрового кода получателя приза происходит путем его формирования слева направо из номеров шаров, поочередно извлекаемых из секции лототрона. Каждый розыгрыш начинается с определения первого разряда Игрового кода победителя слева.

11.5 Первый разряд Игрового кода победителя определяется следующим образом: в секцию лототрона загружаются шары с номерами от 0 по цифру, соответствующую первому разряду зарегистрированного Игрового кода. Шары перемешиваются, и из секции лототрона извлекается шар, номер которого определяет цифру первого разряда выигрышного Игрового кода. Номер шара вносится в протокол.

Далее в сектор лототрона загружаются те номера шаров, которые существуют по сверенному списку Игровых кодов в соответствующем разряде. Шары перемешиваются, и из секции лототрона извлекается шар, номер которого определяет цифру соответствующего разряда выигрышного Игрового кода. Номер шара вносится в протокол.

Для определения последующих разрядов выполняются те же действия. Номера шаров вносятся в протокол.

11.6. Победителем соответствующего розыгрыша считается Участник, Игровой код которого определен согласно п. 11.3–11.5 настоящих Правил.

11.7. Результаты каждого розыгрыша фиксируются в протоколе, который подписывается всеми присутствующими членами Комиссии.

**12. Порядок уведомления победителей о результатах розыгрыша призов Рекламной игры**

12.1. Организатор в течение 7 (семи) календарных дней с момента проведения розыгрыша уведомляет победителя о выигрыше письмом, высланным на электронную почту, указанную Участником при регистрации учетной записи (профиля) на сайте https://www.onliner.by. Организатор также вправе дополнительно уведомить победителя любым удобным ему способом: посредством SMS-рассылки на номер мобильного телефона, звонком по телефону и др.

**13. Порядок получения выигрышей**

13.1. Для получения приза победитель должен явиться не позднее 31.12.2021 (включительно) по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, 5, офис 613, предварительно связавшись с Организатором по номеру многоканального телефона + 375 29 514-35-24.

13.2. Получить приз можно с понедельника по пятницу с 10.00 до 17.00 (исключение составляют приходящиеся на официальные праздники дни), а также в субботу 18.12.2021 с 10.00 до 13.00. При получении приза победитель предъявляет документ, удостоверяющий личность (паспорт – для граждан Республики Беларусь; вид на жительство в Республике Беларусь – для иностранных граждан и лиц без гражданства).

Победитель при получении приза письменно подтверждает факт его получения, заполняет все необходимые документы, предоставленные Организатором, связанные с получением приза.

13.3. Победитель лишается права на получение приза в случаях: неуказания либо указания недостоверных персональных данных в панели управления учетной записи пользователя в интернет-сайте Организатора; непредставления Организатору сведений и документа, необходимых для получения приза; письменного отказа от получения приза либо отказа от подписи в документах, подтверждающих передачу приза; неявки за получением приза в определенный в п. 13.1 срок. В этих случаях приз остается в распоряжении Организатора и может быть использован им по собственному усмотрению.

13.4. В соответствии с главой 18 Налогового кодекса Республики Беларусь Организатор выступает налоговым агентом и при вручении победителю приза обязан удержать у последнего причитающиеся ему денежные средства в качестве уплаты подоходного налога с получателя указанного приза в размере **515** (пятьсот пятнадцать) белорусских рублей **36** (тридцать шесть) копеек.

13.5. Расходы, связанные с проездом победителя к месту получения приза, Организатором не возмещаются.

13.6. Приз не подлежит замене. Выплата денежного эквивалента приза не осуществляется.

13.7. Приз не подлежит выдаче победителю иначе как в порядке, предусмотренном настоящими Правилами.

**14. Информация о Рекламной игре, публикация правил Рекламной игры**

14.1. Правила подлежат опубликованию до начала проведения Рекламной игры в газете «Звязда» и на сайте Организатора – https://www.onliner.by.

14.2. Результаты Рекламной игры будут опубликованы в срок до 23.12.2021 (включительно) в газете «Звязда» и на сайте Организатора – https://www.onliner.by.

14.3. Информацию о правилах и условиях участия в Рекламной игре можно получить на сайте Организатора – https://www.onliner.by (https://b2bblog.onliner.by), а также по номеру многоканального телефона: + 375 29 514-35-24. Звонок платный, в соответствии с тарифами операторов электросвязи, услугами которых пользуется Участник.

**15. Общие условия Рекламной игры**

15.1. Участие в рекламной игре предполагает ознакомление и полное согласие Участника с настоящими Правилами, принятие на себя обязательств по соблюдению всех условий и требований. Несоблюдение Участником требований настоящих Правил признается как его отказ от участия в Рекламной игре.

15.2. Факт участия в Рекламной игре означает, что ее Участник соглашается с использованием его персональных данных в любых рекламных и/или иных информационных материалах, связанных с Рекламной игрой, права на которые принадлежат Организатору.

15.3. Организатор вправе отстранить Участника от участия в Рекламной игре, отказать в выдаче приза при нарушении последним требований настоящих Правил.

15.4. Ответственность за достоверность сведений, персональных и иных данных возлагается на Участника.

15.5. Организатор не несет ответственности за работу сети Интернет при ее использовании Участником (например, за работу компаний, предоставляющих услуги по подключению к сети Интернет Участника), операторов сотовой подвижной электросвязи и организаций, оказывающих услуги интернет-эквайринга (плохое соединение с оператором, отсутствие интернет-эквайринга и т. д.) и почтовых сервисов (сроки доставки электронных сообщений и т. д.).

15.6. При наличии споров между Организатором и Участником Рекламной игры они разрешаются в установленном законодательством Республики Беларусь порядке.

15.7. Претензии по вопросам проведения Рекламной игры принимаются Организатором по адресу: Республика Беларусь, 220069, г. Минск, пр-т Дзержинского, 5 – офис 613, а также посредством электронной почты: game_auto2@onliner.by.

*Свидетельство № 4080 о государственной регистрации Рекламной игры выдано 8 октября 2021 г. Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.*

# КАЛАПС «КРАІНЫ КЕДРАЎ»

## Чаму Ліван ахапіў найцяжэйшы крызіс?

**Ліван перажыў маштабны блэкаўт — ва ўсёй краіне больш за суткі не было электрычнасці. Дзве наймагутнейшыя электрастанцыі дзяржавы — «Аль-Захрані» і «Дэйр-Амар» — спыніліся з-за адсутнасці паліва, якое нельга было купіць з-за недахопу валюты. Мясцовыя чыноўнікі наперабой заяўлялі, што адключэнне святла можа працягнуцца некалькі дзён. Праўда, ужо праз суткі міністр энергетыкі Лівана Валід Фаяд заявіў, што электразабеспячэнне краіны адноўлена да ранейшых магутнасцяў, паколькі знайшлі грошы: Цэнтрабанк дамовіўся пра крэдыт на 100 мільёнаў долараў для закупкі паліва. Месцічы даўно прызвычаіліся да веерных адключэнняў электрычнасці. Пры гэтым энергетычны крызіс — толькі частка праблем Лівана. Жыхары пакутуюць ад катастрафічнага недахопу паліва, лекаў і нават пітной вады. Значная частка насельніцтва краіны, якую некалі па праве называлі «блізкаўсходняй Швейцарыяй», апынулася за рысай беднасці. Чаму Ліван ахапіў найцяжэйшы крызіс, чаго чакаць надалей?**

### ЗА РЫСАЙ БЕДНАСЦІ

Цяперашні крызіс у Ліване ўваходзіць у тройку самых цяжкіх за апошнія 170 гадоў сусветнай гісторыі. Да такой высновы прыйшлі эксперты Сусветнага банка. Тэндэнцыі, на жаль, несуцяшальныя. Сёлета аналітыкі прагназуюць зніжэнне ВУП на 21 працэнт — пасля падзення на 20,3 працэнта ў 2020-м і на 6,7 працэнта ў 2019-м. У абсалютным выражэнні ліванская эканоміка скарацілася з 55 мільярдаў долараў у 2018 годзе да 33 мільярдаў у 2020-м. ВУП у пераліку на душу насельніцтва ўпаў за той жа час на 40 працэнтаў. Леташняя інфляцыя была роўная 84,3 працэнта, саступаючы толькі паказчыкам Венесуэлы і Зімбабвэ. Сотні тысяч сем'яў апынуліся за рысай беднасці, а курс нацыянальнай валюты на чорным рынку абясцэніўся на 129 працэнтаў. Як заўважаюць эксперты, такія засмучальныя вынікі звычайна характэрныя для ваенных канфліктаў ці нават паўнавартасных войнаў і сталі нечаканасцю ў мірны час.

На думку аўтараў даклада Сусветнага банка, з якімі пагаджаецца большасць назіральнікаў, вострая фаза праблем пачалася восенню 2019 года, калі ўрад прыняў меры жорсткай эканоміі, закліканыя выратаваць краіну і яе бюджэт ад банкруцтва.



Былі анансаваныя новыя падаткі, у прыватнасці, беспрэцэдэнтны збор на WhatsApp — шэсць долараў у месяц за магчымасць званкоў у папулярным месенджары. Гэтае рашэнне ўлады неўзабаве адмянілі, але ўвялі іншыя падаткі, адначасова скараціўшы пенсіі і зарплаты дзяржслужачых.

Вельмі непапулярны крок прывёў да масавых пратэстаў: дзясяткі тысяч чалавек выйшлі на цэнтральныя вуліцы і плошчы найбуйнейшых гарадоў Лівана — Бейрута, Біблаcа, Сайды. Непапулярныя меры сталі толькі фармальнай нагодай для выступленняў — незадаволенасць грамадзян назапашвалася гадамі і была звязана з карупцыяй, якая пракралася ва ўсе сферы эканомікі, перабоямі ў пастаўках бензіну, а таксама ў электра- і водазабеспячэнні. Амаль ва ўсіх установах і ў двары кожнага жылога дома тут даўно стаяць аўтаномныя электрагенератары, пры дапамозе якіх людзі чакалі доўгія гадзіны без святла.

**На новы ўрад ускладаюцца асаблівыя спадзяванні. Яго ўзначаліў Наджыб Мікацi — адзін з самых заможных ліванцаў, а ў спісе найбагацейшых людзей планеты ён займае 446-е месца з капіталам не менш чым 2,6 мільярда долараў.**

Стаміліся ліванцы і ад высокага ўзроўню сацыяльна-эканамічнай няроўнасці, адзначае lenta.ru. Паводле статыстыкі міжнародных арганізацый, адзін працэнт найбагацейшых жыхароў краіны валодае чвэрцю ВУП, 10 працэнтаў найбольш заможных — 55 працэнтамі ад агульнага нацыянальнага даходу. Такое становішча спраў стала пабочным эфектам «ліванскага эканамічнага цуду», аб якім спецыялісты казалі аж да пачатку 2011-га, калі разгарэлася «арабская вясна» — серыя рэвалюцый у Паўночнай Афрыцы і на Блізкім Усходзе.

### АД ДЭФОЛТУ ДА ВЫБУХУ

Ужо ў сакавіку 2020-га новы ўрад пад кіраўніцтвам Хасана Дзіяба аб'явіў пра дэфолт — адмове адказваць па абавязацельствах, якія на той момант складалі 1,2 мільярда долараў. Фактычна краіна стала банкрутам. Далей сітуацыя толькі пагаршалася, чаму спрыяла ўвядзенне карантыну з-за каранавіруса, закрыццё многіх прадпрыемстваў і, як вынік, рост беспрацоўя да 25 працэнтаў. Дзіяб і яго ўрад не карысталіся падтрымкай насельніцтва, якое лічыла іх стаўленікамі ранейшых улад. Да таго ж ліванскія бальніцы не спраўляліся з наплывам захварэлых на каранавірус.



Летась у сярэдзіне вясны з'явілася кволая надзея на паляпшэнне, калі ўрад дамовіўся з Міжнародным валютным фондам (МВФ) аб выдзяленні дапамогі ў памеры дзесяці мільярдаў долараў на працягу чатырох гадоў. Сродкі павінны былі пайсці на рэканструкцыю прамысловасці і стварэнне новых працоўных месцаў, але вылучыць іх фонд гатовы быў толькі пры ўмове тэрміновых палітычных рэформаў і поўнай справаздачнасці аб эканамічнай сітуацыі ў краіне, чаго ў выніку так і не было зроблена.

А ў пачатку жніўня 2020-га ў порце Бейрута адбыўся выбух, які быў прызнаны адной з найбуйнейшых тэхнагенных катастроф у гісторыі чалавецтва. Выбухнулі 2,7 тысячы тон аміячнай салетры, якая захоўвалася на складах з 2014-га, загінулі 207 гараджан (яшчэ больш за 700 атрымалі раненні), была пашкоджана амаль трэць ліванскай сталіцы. Некаторыя раёны былі цалкам пахаваныя пад заваламі. Але самым балючым наступствам стала разбурэнне склада медыкаментаў і элеватара, дзе захоўвалася каля 85 працэнтаў усяго нацыянальнага запасу збожжа. У цэлым порт забяспечваў каля 60 працэнтаў усяго імпарту Лівана, які практычна цалкам залежыць ад паставак самых неабходных тавараў з-за мяжы.

Тое, што здарылася, прывяло да імгненнай адстаўкі ўрада Дзіяба, але новага прызначыць не ўдалося, таму міністры працягнулі працаваць на сваіх ранейшых пасадах з прыстаўкамі выконваючых абавязкі. Сёлета ў лютым у краіне пачалі працаваць следчыя швейцарскай пракуратуры, заўважыла lenta.ru. Яны спрабуюць разабрацца ў дзейнасці Цэнтрабанка і асабіста яго старшыні Рыяда Саламе. Яго падазраюць у шматлікіх парушэннях і растраце каля 350 мільёнаў долараў. Аб ходзе расследавання пакуль нічога не вядома, паколькі Міністэрства замежных спраў папрасіла яго засакрэціць.

### НА ПАРАХАВОЙ БОЧЦЫ

Увесну ў Ліване амаль не было дэманстрацый: умовамі аднаго найбольш жорсткіх у свеце лакдаўнаў забаранялася свабоднае перамяшчэнне па вуліцах. Але, як толькі абмежаванні былі знятыя, пратэсты аднавіліся з новай сілай. У кастрычніку мінулага года прэзідэнт Мішэль Аун даручыў Сааду Харыры трэці раз узначаліць урад, аднак за наступныя восем месяцаў яны так і не здолелі дамовіцца аб канкрэтных кандыдатурах, і ў ліпені 2021-га Харыры абвясціў аб спыненні спроб сфарміраваць кабмін.

Як лічыць аналітык Тоні Хуры, якога згадвае ТАСС, у цяперашняй сітуацыі, калі Ліван застаецца парахавой бочкай Блізкага Усходу, «любы, хто пагаджаецца заняць крэсла прэм'ер-міністра, рызыкуе здзейсніць палітычнае самагубства». Тым не менш на новы ўрад ускладаюцца асаблівыя спадзяванні. Яго ўзначаліў Наджыб Мікацi — адзін з самых заможных ліванцаў, а ў спісе найбагацейшых людзей планеты ён займае 446-е месца з капіталам не менш чым 2,6 мільярда долараў. 65-гадовы палітык і бізнесмен стварыў 10 верасня ў Ліване ўрад нацыянальнага выратавання, які зоймецца правядзеннем рэформ і рэканструкцыяй Бейрута пасля леташняга выбуху ў марскім порце. 20 верасня новы кабінет атрымаў вотум даверу ў аднапалатным парламенце. Адметна, што раней Мікацi двойчы ўзначальваў урад Лівана: падчас вострага палітычнага супрацьстаяння ў 2005-м, калі быў забіты тагачасны прэм'ер Рафік Харыры (адзін з найбольш адметных кіраўнікоў у найноўшай гісторыі Лівана), а таксама ў 2011—2014 гадах, у разгар крызісу ў суседняй Сірыі.



### АГОНЬ НА ПАРАЖЭННЕ

За мінулы год Ліван перажыў яшчэ шмат узрушэнняў. Пачасціліся і сталі нормай масавыя адключэнні электрычнасці і вады, перабоі з газазабеспячэннем. Недахоп бензіну, які пастаўляецца з-за мяжы, прывёў да шматкіламетровых чэргаў на АЗС і вымусіў многіх адмовіцца ад паездак на асабістых аўто. Заможныя пастаўшчыкі гатовыя адгружаць паліва толькі на ўмовах поўнай перадаплаты. З-за адсутнасці паліва ліванцы не могуць выкарыстоўваць электрагенератары, што асабліва крытычна летам, калі на вуліцы вельмі горача і кандыцыянеры — проста жыццёвая неабходнасць. У бальніцах востры недахоп медыкаментаў, у той час як многія жыхары Бейрута не акрыялі ад наступстваў выбуху. На вуліцах гарадоў масава знікаюць каналізацыйныя люкі з каштоўных металаў, а паліцыя фіксуе рэкордную колькасць самагубстваў, адзначае lenta.ru.

Банкаўская сістэма перажывае калапс, у выніку якога грамадзяне краіны страцілі доступ да сваіх валютных зберажэнняў, а атрыманне наяўных сродкаў у фунтах строга абмежавана. Курс нацыянальнай валюты апусціўся да дзесяці тысяч за долар (у дзесяць разоў ніжэй пакуль яшчэ дзеючага афіцыйнага), а сярэдняя зарплата за апошнія два гады звалілася з 670 да 67 долараў.

Сродкаў не хапае нават на войска — адзіную сілу, якая патэнцыйна можа прадухіліць у краіне новую грамадзянскую вайну. «Як салдат можа ўтрымліваць сям'ю, калі яго зарплата не перавышае 90 долараў? — спытаў у сярэдзіне чэрвеня камандуючы арміі генерал Жозэф Аун (цёзка прэзідэнта) падчас анлайн-сустрэчы, арганізаванай французскімі ўладамі. — Сітуацыя крытычная. Калі не прыняць меры, эканамічны і фінансавы крызіс непазбежна прывядзе да краху ўсіх дзяржаўных інстытутаў, уключаючы ліванскія ўзброеныя сілы». Ад безвыходнасці мясцовыя ваенныя вырашылі зарабляць на турыстах: усе ахвотныя сёння могуць палётаць на ваенным самалёце. Экскурсія абыдзецца ў 150 еўра.

Палажэнне магла б выправіць падтрымка з-за мяжы, і многія краіны, адгукнуўшыся на заклік Францыі, якая адчувае адказнасць за лёс колішняй калоніі, гатовыя даць мэтавы крэдыт. Аднак, як мяркуе аглядальнік саудаўскай газеты Ashsarq al-Awsat Мухамед Шукейр, у найбліжэйшы час Ліван наўрад ці дачакаецца салідных інвестыцый ад Захаду і багатых дзяржаў Персідскага заліва. «Дапамога будзе дазаваная, як кісларод», — лічыць аналітык. Яшчэ ў 2017-м, пасля раптоўнага абвяшчэння аб адстаўцы Саада Харыры, у Парыжы была сфарміравана Канферэнцыя за эканамічнае развіццё і рэформы (CEDRE), мэтай якой была арганізацыя дапамогі Лівану. З урадам заключылі «пагадненне аб даверы», якое павінна было адкрыць Бейруту доступ да крэдытнага траншу, але яго ўмовы так і не былі выкананы.

**Энергетычны крызіс — толькі частка праблем Лівана. Жыхары пакутуюць ад катастрафічнага недахопу паліва, лекаў і нават пітной вады. Значная частка насельніцтва краіны, якую некалі па праве называлі «блізкаўсходняй Швейцарыяй», апынулася за рысай беднасці.**

Весткі, якія паступаюць з Лівана, несуцяшальныя. Так, днямі стала вядома, што сем чалавек загінулі і дзясяткі атрымалі раненні ў выніку перастрэлак, якія ўзніклі падчас акцыі пратэсту ў Бейруце. Пра гэта паведаміў тэлеканал Al Hadath. Разлютаваныя перастрэлкі сціхлі толькі пасля таго, як вайсковыя патрулі размясціліся ў раёнах, дзе ўзніклі беспарадкі. Камандаванне ўзброеных сіл папярэдзіла, што «ваенныя будуць адкрываць агонь на паражэнне па любым мінаку, які выйшаў на вуліцу са зброяй». Са зваротам да народа выступіў прэм'ер-міністр Лівана Наджыб Мікацi, які заклікаў грамадзян «захоўваць спакой і не дапусціць спаўзання дзяржавы да міжусобіц». Так што калапс у «краіне кедраў» у разгары і выйсця пакуль не відаць.

**Захар БУРАК.**

# ВОСЕНЬСКІ СУПЕРФУД

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Для беларусаў журавіны, мабыць, — такі ж значны нацыянальны прадукт, як для італьянцаў — вінаград, а для грэкаў — аліўкі. З прыходам восені яны вызначаюць рытм жыцця людзей у тых месцах, дзе іх расце багата, — у рэгіёнах з балотамі. У першую чаргу гэта Брэстчына і Гомельшчына, а дакладней — Палессе.

## ПАЧЫМ І АДКУЛЬ

— У нас, у ваколіцах Баранавічаў, журавін звычайна няшмат, — дзеліцца **намеснік старшыні Баранавіцкага райпо па нарыхтоўках, вытворчасці і знешнеэканамічнай дзейнасці Іосіф ШУСТАЛ**. — Але гэтай восенню досыць актыўна здае іх насельніцтва і ў нас.

**Сакрэт карысці журавін — у іх хімічным складзе. Гэтыя ягады змяшчаюць рэкордную колькасць вітаміну C, вітаміны групы B, PP, K1, нікатынавую, бензойную і цытрынавую кіслоты, глюкозу і фруктозу. З мікра- і макраэлементаў — фосфар, кальцый, калій, марганец, ёд, магній, жалеза, медзь, малібдэн, нікель, барый, бор, кабальт, срэбра, хром, алюміній.**

Дарэчы, журавіны сёлета афіцыйна дазволена збіраць жыхарам Брэсцкай і Гомельскай абласцей з 4 верасня. З 6-га журавінавы сезон пачаўся на Гродзеншчыне і Магілёўшчыне, з 8-га — у Віцебскай і Мінскай абласцях. Асноўныя «радовішча» ўнікальных ягад — наваколлі Ганцавіч і Ляхавіч, Драгічына і Пінска, расказвае Іосіф Баляслававіч. Менавіта там на сезон журавін людзі бяруць адпачынкі. У дзень спрытны работнік можа зарабіць на журавінах 100 рублёў і нават больш. Ёсць ураджай журавін і на Віцебшчыне — напрыклад, за імі ездзяць на балота Ельня. Прымаюць журавіны ў гэтым годзе аднosna дорага, кажа Іосіф Шустал, — па 5,50 за кілаграм. За вядро можна выручыць 50—60 рублёў. І гэта калі не затлумляцца і проста здаваць ягады нарыхтоўшчыкам. А калі паехаць у абласныя цэнтры або ў Мінск, зарабіць можна больш (на сталічных рынках самая хадавая цана на журавіны — 8 рублёў за кілаграм, хоць можна знайсці і па 7,50, і нават па 7). Праўда, варта ўлічыць транспартныя выдаткі. На Камароўку журавіны прыязджаюць за 250—300 кіламетраў.

— Ці ж мы дорага прадаём? Вы паспрабуйце збярыце такое вядзерца! — нязлосна пярэчыць мне жанчына сярэдніх гадоў на камароўскіх радах, дзе гандлююць прыватнікі. — Гэта ж не чарніцы, якія можна збіраць камбайнам. Тут кожнай ягадцы трэба «пакланіцца».

Калі хто не ведае, растуць журавіны на купінах. Знойдзеш такую «ягадную» купіну — на ёй ягад 15—20. Так, ад купіны да купіны, запаўняецца вядзерца. Ручным камбайнам журавіны можна збіраць, толькі калі ягаднік нізкі. Але часцей даводзіцца карыстацца «дзедаўскім метадам» — нагінацца за кожнай ягадкай.

Аказваецца, журавіны сапраўды любяць журавы: яны доўгай дзюбай выбіраюць ягадкі з моху. Зрэшты, людзям яны не складаюць канкурэнцыі. «Прафесійныя рызыкі» пры зборы журавін — магчымасць заблудзіцца і... змеі. Расказваюць, вужак на балоце заўважыць няпроста, яны «зліваюцца з ландшафтам». Цягнешся за ягадкай, а змяя нечакана вынаўзае літаральна з-пад пальцаў. У асноўным, вядома, гэта бясхрыўдныя вужыкі, але можа быць і гадзюка. А заблудзіцца ў лесе рызыку нават сельскі жыхар, які ўсё жыццё правёў на ўлонні прыроды. Хоць больш шанцаў згубіцца, вядома ж, у гараджан, якія выраўшылі ў сезон журавін «наблізіцца да вытокаў». Навошта гараджане адпраўляюцца ў лес? Паход у ягады — занятак азартны і пры гэтым заспакаяльны, медытатыўны (калі правільна апранууся: зразумела, без гумовых ботаў і цёплых пальчатак змерзнеш вельмі хутка, нягледзячы на падманлівае восеньскае цяпло). Асабліва калі не гонішся за аб'ёмамі і не плануеш на журавінах зарабіць.

— Чым хутчэй паступае зварот, што прапаў чалавек у лесе, тым большая верагоднасць знайсці яго жывым. Ён не паспеў змерзнуць, загінуць, памерці з-за таго, што не прыняў таблеткі ад хранічнага захворвання, — кажа **кіраўнік пошукава-ратавальнага атрада «Анёл» Сяргей КОЎГАН**. — Калі пра знікненне заявілі адразу, мы аператыўна выязджаем на месца і амаль заўсёды знаходзім чалавека жывым. А калі гэта адзінокая бабуля, і суседзі толькі праз некалькі дзён заўважылі, што яе няма дома, то, вядома, верагоднасць адшукаць такога зніклага чалавека жывым рэзка зніжаецца.

Важна не губляць час на самастойныя пошукі — адразу ж тэлефануйце ў экстранныя службы, кажуць спецыялісты. Тым больш што часцей за ўсё даводзіцца шукаць у лесе дзяцей, падлеткаў і пажылых.

— Практыка паказвае, што часта звароты аб знікненні чалавека ў лесе паступаюць, калі пачынае цямнець, — распавядае інфармацыйны каардынатар атрада «Анёл» Юлія. — «Ды ён дрэнна ходзіць!», «Яна сказала, што далёка не пойдзе!» — для нас гэта ўжо як «сігнальная лямпачка». На самай справе пенсіянеры часам забіраюцца на 10—15 кіламетраў у глыб лесу.








## НЕ ГУБЛЯЙСЯ!

Сезон збору журавін — гарачы час для ратавальнікаў. Хоць наогул «лясны сезон» у іх пачынаецца з прыходам цяпла і доўжыцца да халадоў. Пікі актыўнасці, калі людзі губляюцца ў лесе найбольш часта, — час збору чарніц, лісічак, баравікоў, і завяршальны пік — сезон журавін. Ратавальнікі гавораць: шанцы выжыць у лесе ў таго, хто заблукаў, тым большыя, чым цяплейшае надвор'е: халодныя ночы пагражаюць пераахаладжэннем.

У лесе найважнейшым фактарам з'яўляецца час, падкрэсілі ў пошукава-ратавальным атрадзе «Анёл» і нагадалі: на першыя суткі верагоднасць знайсці чалавека жывым складае больш чым 90 %, на другія — можна адымаць 30 %, на трэція — яшчэ трыццаць.

**Меры засцярогі перад паходам па журавіны нескладаныя, але без іх прагулка ў лес або на балота можа абярнуцца бядой.**

• Паведаміце блізкім, сябрам ці суседзям, куды дакладна вы накіроўваецеся — гэта звузіць радыус пошуку. Таксама паведаміце час вашага выхаду і час, калі плануеце вярнуцца.

• Вазьміце з сабой карту. Звяртайце ўвагу на арыенціры на мясцовасці, па якіх будзеце вяртацца дадому. Лепш захапіць і компас.

• Абавязкова збярыце ў дарогу трохі ежы, ваду, запалкі (а лепш запальнічку — запалкі лёгка могуць папсавацца ад вільгаці).

• Не апранайцеся ў камуфляж або шэрае. Журавіны не будуць хавацца ад вас, а ратавальнікам лягчэй заўважыць сярод дрэў чалавека ў чырвонай куртцы (у ідэале — са святлоадбівальнымі элементамі), чым у шэрай або колеру хакі.

• Цалкам зарадзіце тэлефон: вы зможаце датэлефанавацца па экстранных нумарах, нават калі ў лесе не будзе сеткі, кажуць ратавальнікі.

• Калі вы заблукалі, паведаміце пра сябе і заставайцеся на месцы. Калі прыйшлося заначаваць у лесе, нарвіце сухога лапніку і зрабіце падсціл — іглічныя галінкі дапамогуць зберагчы цяпло. Распаліце вогнішча і паешце, але не з'ядайце ўсё адразу.

• Вы не ўзялі з сабой тэлефон і ведаеце, што вашу адсутнасць заўважаць не адразу? Паспрабуйце ўслухацца. Магчыма, вы пачуеце шум аўтадарогі, электрычкі, сабачы брэх. Дарога (сцяжынка), рака, лінія электраперадачы — гэта лінейныя арыенціры, якія прывядуць вас да выхаду з лесу, а магчыма, і да населенага пункта.

## ЗАМАРОЗІЦЬ АБО ВЫСУШЫЦЬ?

— Перш чым купіць журавіны, неабходна вызначыць іх якасць, — раіць **навуковы супрацоўнік аддзела харчавання РНПЦ НАН Беларусі па харчаванні Ганна ЖУРНЯ**. — Ягады павінны быць чырвоныя, бліскучыя і цвёрдыя навобмацак. Бледнаватая афарбоўка паказвае на няспеласць. Абавязкова ўдакладніце, у якім раёне сабраныя ягады: журавіны валодаюць асаблівай здольнасцю інтэнсіўна назапашваць цяжкія металы і пестыцыды.

Спецыялісты правільнага харчавання называюць журавіны суперфудам.

— Сакрэт карысці журавін — у іх хімічным складзе, — адзначае спецыяліст. — Гэтыя ягады змяшчаюць рэкордную колькасць вітаміну C, вітаміны групы B, PP, K1, нікатынавую, бензойную і цытрынавую кіслоты, глюкозу і фруктозу. З мікра- і макраэлементаў — фосфар, кальцый, калій, марганец, ёд, магній, жалеза, медзь, малібдэн, нікель, барый, бор, кобальт, срэбра, хром, алюміній.

Гаючыя ўласцівасці журавін выкарыстоўваюць пры сардэчна-сасудзістых захворваннях, для зніжэння ўзроўню халестэрыну ў крыві, пры нестабільным артэрыяльным ціску, а таксама для прафілактыкі інфекцый мочавывадзячых шляхоў, кажа суразмоўніца. Журавіны ўжываюць для лячэння захворванняў мачавога пузыра, страўніка і печані, цукровага дыябету, для апрацоўкі ран. Але самыя вядомыя іх уласцівасці — гарачкапаніжальныя і супрацьзапаленчыя. Асабліва эфектыўныя журавіны пры комплексным лячэнні вірусных захворванняў: узмацняюць дзеянне антыбіётыкаў і ўмацоўваюць імунную сістэму.

У прамысловых маштабах у журавін досыць шырокае прымяненне. Гэта і кандытарская вытворчасць, і кансервацыя, і напоі (алкагольныя і безалкагольныя), і амаладжальная касметыка. Адзін з нацыянальных кулінарных брэндаў — журавіны ў цукровай пудры, традыцыйны салодкі сувенір з нашай краіны. Ну, а хатнія нарыхтоўкі з журавінамі — гэта, вядома, у першую чаргу варэнне.

— Кандытарскі выраб «Журавіны ў цукровай пудры» і журавіны, перацёртыя з цукрам, захоўваюць свае карысныя ўласцівасці, хоць выяўленыя яны ў меншай ступені, чым у свежасабраных ягадах, — кажа спецыяліст. — Лепш за ўсё дадаць у свежыя перацёртыя журавіны мёд. Зрэшты, калі параўноўваць гэтыя прадукты з варэннем, то ўсе вышэйпералічаныя больш пераважныя, бо вялікая колькасць дададанага цукру можа негатыўна адбіцца на вашым здароўі. Тым, хто аддае перавагу журавінаваму варэнню, можна парэкамендаваць непрацяглую тэмпературную апрацоўку (не больш за пяць хвілін), каб захаваць максімальную колькасць вітамінаў і мінералаў у нарыхтоўцы. Пры куплі журавінавага соку выбірайце гатунак з найменшай колькасцю цукру. Стандартная порцыя журавінавага соку — не больш за 1/2 шклянкі за раз.

Ну, а карысней за ўсё есці журавіны проста так. Дыетолагі кажуць: дзякуючы бензойнай кіслаце ў складзе гэтыя ягады могуць заставацца свежымі вельмі доўга.

— Існуе шмат спосабаў захоўваць журавіны: у халадзільніку, у халоднай кіпячонай вадзе, з цукрам. Сярэдні тэрмін захоўвання свежых ягад — 3-4 месяцы.

Свежыя журавіны выдатна замарожваюцца. Ягады трэба перабраць, выдаліць лісцікі, галінкі, старанна прамыць і прасушыць на ручніку. Пасля гэтага ягады замарожваюць. У маразільнай камеры захоўваць журавіны можна год і даўжэй. Праўда, калі ягады адтаялі, паўторна іх замарожваць нельга.

Таксама журавіны можна захоўваць у сушаным (вэнджаным) выглядзе. Аўтэнтычны палескі спосаб — вэндзіць ягады ў печы. З улікам сучасных рэалій можна дамагчыся аналагічнага выніку і ў духоўцы. Некалькі хвілін бланшыруем журавіны ў кіпені, прасушваем на ручніку, выкладваем на процівень роўным слоем і адпраўляем у духоўку пры 95 градусах. Хвілін праз 20—30 трэба паменшыць жар да 60 градусаў. Такім чынам ягады вэндзіцца 7-8 гадзін. Час ад часу іх трэба варушыць.

І напрыканцы — незвычайны рэцэпт варэння ад прадаўца журавін.

— Асабіста мне вельмі падабаецца варэнне з журавін з кедровымі арэшкамі, — дзеліцца Ірына, што гандлюе журавінамі на Заходнім рынку Мінска. — 700 г журавін засыпаем паўкіло цукру і варым на маленькім агні да стану пюрэ. Дадаём парэзаныя долькамі яблыкі (грам 700—800) і 50 г кедравых арэшкаў. Варым, памешваючы, яшчэ 20 хвілін. Усё, можна закручваць у прастэрылізаваныя слоікі. Смачна неверагодна!

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

БЕЛАРУСБАНК

**ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк»**

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2021 г.

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2021 год | 2020 год |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
